# Ганна СКАРЖЫНСКАЯ-САВІЦКАЯ




*Ганна Іосіфаўна Скаржынская-Савіцкая, дзіцячая пісьменніца, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, нарадзілася 3 жніўня 1966 г. у вёсцы Куцы Лес Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці ў мнагадзетнай сям'і.*

*У 1981 годзе закончыла Таневіцкую васьмігадовую школу. У 1985 годзе – Гродзенскі хіміка-тэхналагічны тэхнікум. Пасля заканчэння працавала на Гродзенскім заводзе аўтаагрэгатаў.*

*Друкавалася ў часопісах "Вясёлка", "Рукзачок", "Пралеска", "Целитель" "Детские сказки", у газетах "Гродзенская праўда", "Перспектива", "Вечерний Гродно", "Настаўніцкая газета", "Дзянніца", у калектыўных зборніках "Пакліч у госці сонца" і "Вясёлка". А таксама у альманаху "На нёманскай хвалі". Казкі і апавяданні гучаць у перадачы "Вячэрняя казка" на беларускім рэспубліканскім радыё.*

*Выдала кнігі для дзяцей "Вечарынка" (Гродна, 2008г.), "Расінка і Сонечны зайчык" (Гродна, 2010г.), "Приключения хомячка Тошки" (Гродна, 2010г.). У выдавецтве "Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі" выйшлі кнігі "Прыгоды хамячка Тошкі" (2013г.) і "Казкі-чамучкі" (2013г.), "Надзейка-чарадзейка"(2014г.). У выдавецтве "ЮрСаПрынт" выйшлі кнігі "Вавёрчын баравік"(2014г.) і "Кветка малой радзімы" (2014г.).*

*Лаурэат прэміі імя А. Дубко Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта “За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва” ў намінацыі “Пісьменнік гада-2014”.*
*Жыве ў Гродна, працуе ў Таварыстве з абмежаванай адказнасцю “З-СБ”.*

*Самым каштоўным у жыцці лічыць тое, што засягнута ўласнай працай, уласнымі намаганнямі.*

**АПАВЯДАННІІКАЗКІ**

**ЗКНІГІ**

**ДЛЯДЗЯЦЕЙ**

# КВЕТКА

# МАЛОЙ

# РАДЗІМЫ



*Кнігу **“Кветка малой радзімы”** я прысвяціла мясцінам, з якімі было звязана маё дзяцінства і школьныя гады. Куды і цяпер наведваюся з задавальненнем, каб абняць маму і тату, адпачыць ад гарадской мітусні, прайсціся сцежкамі далёкага дзяцінства, адчуць сябе часцінкай самага дарагога і шчымлівага – малой радзімы, роднай Бацькаўшчыны.*

## КВЕТКА МАЛОЙ РАДЗІМЫ

Майская таямнічая раніца разбудзіла мяне яркім сонечным праменьчыкам, які толькі што сам прачнуўся і гарэзліва скокнуў да мяне на мяккую падушку. Ад яркага бліку я расплюшчыла вочы і мімаволі прыжмурылася, адчуваючы ў сябе на носе залаты праменьчык. Праз акно бацькоўскай хаты, як і кожную летнюю сонечную раніцу ў дзяцінстве, мне ўсміхалася Сонца, але неяк загадкава.

– Уставай, ужо ўсе прачнуліся! Колькі цудаў вакол! Уставай, бо ўсё праспіш! – настойліва будзіла яно.

Я ўсміхнулася, салодка пацягнулася, ветліва памахала Сонцу рукой і павольна ўстала з ложка.

Расчыніла акно ў сад… А там дзіва! Пад аркестр шпакоў, апранутых у чорныя святочныя фракі, у бялюткіх як снег сукенках танцавалі вішні і слівы. У ружовым убранні, колеру лёгкага ранішняга світанку, весела кружыліся яблыні. Гэта чараўніца-вясна ладкавала казачны баль у нашым садзе. А які водар уварваўся да мяне ў пакой! Я ўдыхнула яго, і мне захацелася разам з дрэвамі танцаваць, кружыцца, узляцець на лёгкіх крылах прыгажуні-вясны. Раніца настойліва клікала мяне. І я з задавальненнем згадзілася на яе

запрашэнне: прайсціся па лесе, паслухаць непаўторны чароўны спеў птушак, пагаварыць з прыродай.

Праз некаторы час я нетаропка крочыла па роснай траве ў лес. Кропелькі-расінкі гарэзліва пераміргваліся з вясёлымі сонечнымі зайчыкамі. Яны пераліваліся мноствам рознакаляровых бліскчынак, радасна гуляючы на сонцы, якое паднялося вышэй над лесам і жоўтым грабеньчыкам расчэсвала сіняватыя верхавіны дрэў.

Знаёмай сцяжынкай, якою больш чым трыццаць гадоў назад хадзіла ў школу, я падышла да блакітнай, тоненькай, нібы дзявочы пасачак, безыменнай рачулкі і прыслухалася. Яна штосьці гаманіла.

– Дзінь-дзінь-дзінь-дзілінь! Якая прыгажосць! Дзінь-дзінь-дзінь-дзілінь! Я адчуваю асалоду волі і жыцця! Дзінь-дзінь! Я вызвалілася ад тоўстага цяжкага лёду, які скоўваў мяне ўсю зіму! Дзінь-дзінь, я радуюся сонцу і вясне! – цурчала празрыстая вадзічка. – Дзінь-дзінь, паглядзі, якія букеты сонечнай лотаці падарыла мне шчодрая вясна! Палюбуйся, якімі цудоўнымі карункамі кветак упрыгожыла мае берагі гэтая непаседлівая рукадзельніца. Падыдзі далей, за апошнім букетам жоўтай лотаці, перад паваротам струменіць жыццярадасная крынічка. Вада ў ёй крыштальна-чыстая і гаючая. Напіся яе – будзеш здаровай не толькі целам, але і душою! – бесперапынна гаманіла Рэчка.

– Дзякуй табе, Рачулка! – падзякавала я і ўспомніла, што сапраўды у гэтым месцы б’е крынічка. Крынічка нашага дзяцінства. Мы, стомленыя дарогаю ў школу, прыходзілі сюды, каб напіцца яе асвяжальнай вады і падбадзёрыцца. Асабліва ў спякотныя майскія дні.

– Частуйся, частуйся! – ветліва спявала срэбным галаском Крынічка.

І я прысела, каб набраць у далоні халоднай вады. Павольна смакавала яе і ўспаміналa, што ў дзяцінстве здавалася: смачнейшай, саладзейшай і чысцейшай вады няма на свеце. Безумоўна, так і атрымалася. Вада маёй радзімы, майго шчаслівага рознакаляровага дзяцінства, якая ўвабрала ў сябе любоў і пяшчоту сонечнага цяпла, водар чыстага свежага паветра, размаітых кветак і травінак, звонкія вясёлыя спевы птушак, для мяне не мае параўнання ні з якой іншай вадой на свеце.

Я сядзела каля вясёлай ветлівай Крынічкі і размаўляла з ёю.
А потым яшчэ раз падставіла далоні пад прыродны выток жыватворнай вады. Абмыла твар і адчула бадзёрасць і жыццярадаснасць ва ўсім целе, бо душа мая ўжо напаўнялася дабрынёй і святлом, жыла дыханнем вясны, цешылася з цудаў прыроды.

– Дзякуй, Рачулка! Дзякуй, Крынічка! Сапраўды гаючая твая вада! – яшчэ раз падзякавала я.

І тут прыляцеў свавольнік Вецер. Ён, нібы пушынку, закружыў мяне на руках і шапнуў сваім свежым, духмяным, напоўненым майскім густым водарам квітнеючых палёў дыханнем:

– Сёння на сонечнай палянцы, у карагодзе танцуючых матылькоў, закрасавала чароўная кветка. Я, Сонца, Зямля, Неба гадавалі яе, як самае дарагое дзіця прыроды. Зямля клапацілася, як маці аддавала ёй сваю любоў

і ласку, усё самае карыснае і пажыўнае. Сонца спавівала кветку сваімі пяшчотнымі цёплымі прамянямі. Неба паіла яе чыстаю свежаю вадою. А я лётаў-насіўся па белым свеце і збіраў самыя каштоўныя, цудоўныя казкі і песні, а вечарам калыхаў-люляў кветку. І яна засынала на маіх моцных надзейных крылах, пад красамоўныя чароўныя казкі і песні. Кветку гэтую не проста адшукаць, яе не кожны знойдзе. Скажу толькі, яе адшукае той, хто мае чыстую і светлую душу, струнку незвычайнага дару…

– Вось як?! – здзівілася я. – Цікава! Дык падкажы хоць, у якім накірунку ісці шукаць?

– У накірунку любові, чысціні і разумення, – загадкава шапнуў мне Вецер. Ён жартаўліва ўзлахмаціў фрызуру адзінокай маладой бярозцы і кудысьці памчаўся.

– Азадачыў ты мяне, гарэза-Вецер! Але я знайду гэтую таямнічую кветку!

– кінула я яму наўздагон. – Мне падкажа маё ўнутранае пачуццё, мая інтуіцыя!

Я накіравалася ў бок лесу, пераскоквала з купінкі на купінку, каб не трапіць у балота. Раптам з-пад маіх ног, з высокай травы, выпырхнула птушка і заспявала над галавой. Песня спачатку звінела тонкаструннымі крыштальнымі званочкамі, пералівалася вясновым цяплом, прывітальнай радасцю, а потым змянілася нейкім сумам, незразумелай трывогай.

– Жаўраначак! – звярнулася я да птушкі. – Чаго так трывожна спяваеш? Што здарылася? Яшчэ ў далёкім дзяцінстве я слухала твае цудоўныя песні і зачароўвалася іх меладычнасцю і незвычайнай сугучнасцю гукаў. Твайму трапяткому палёту я крыху зайздросціла, што не магу так, як ты ўзняцца над зямлёй. Марыла хоць на хвілінку стаць птушкай і з вышыні птушынага палёту зірнуць на зямную прыгажосць.

Раптам здалёк, у невялічкай ямцы я заўважыла гняздо з сухой травы, а там прыкрытыя пухам шэсць землянога колеру яечак. І тады – зразумела трывожную песню птушкі – будучай мамы.

– Не бойся і не хвалюйся, я нават не падыду да твайго гнязда! Ляці, выседжвай дзетак! – крыкнула я жаўруку, а сама хутчэй падалася ў лес.

На ўскрайку лесу, грэючыся на сонцы, мяне віталі суніцы. Здзівіла тое, што яны ўжо пачыналі квітнець. Нібы сарамлівыя выданніцы, апранаючы шлюбныя сукенкі, яны сціпла распускалі свае першыя белыя пялёсткі. А вось пралескі амаль што скінулі сваё веснавое блакітнае ўбранне. Дзе-нідзе квітнела яшчэ сон-трава, нахіліўшы да зямлі сціплыя галоўкі-званочкі.

Лес пачынаў абуджацца. Птушкі радаваліся яснаму сонечнаму ранку. Яны чысцілі свае пёрыначкі,цвіркалі і, шчабечучы выляталі з гнёздаў. Дзесьці недалёка закрычала сойка:

– Добрай раніцы! Добрага працоўнага дня! – віталася яна.

У адказ ёй шчыра адгукнуліся іншыя птушкі. Па чыёйсьці просьбе адбіваў ранішнюю тэлеграму дзяцел, стараючыся не прапусціць і не пераблытаць ніводнага слова. У гушчары лесу закукавала зязюля – лічыла мае гадочкі. Пачулася лёгкая, хвалюючая мелодыя ляснога жаўрука. Ён, нібы мацуючы голас, усё больш і больш набіраў вышыню гучання.

Напаўняючы самымі цудоўнымі каларытурамі музыкі, выводзіў прывітальную руладу маэстра салавей. Іх падхапілі малінаўкі. З глыбіні лесу пачуўся меладычны свіст івалгі. І іншыя незнаёмыя мне птушкі напоўнілі лес звонкім чаруючым спевам-шчэбетам. Здавалася, што такой музыкі, такога майстэрства не пачуеш ні на адным харавым канцэрце ў свеце. Галасы птушак гучалі флейтай, пераліваліся арфай, плакалі скрыпкай. Птушкі нагадвалі мне канкурсантаў, якія наперабой стараліся выдаць самы лепшы музычны твор. І толькі дзікі голуб час ад часу перабіваў сваім басістым “Тур-тур, тур-тур!” гэтыя тонкія вясновыя мелодыі, якія напаўнялі душу цеплынёй, каханнем і самымі цудоўнымі чалавечымі пачуццямі.

Сонца паднялося яшчэ вышэй і настойліва прабіралася скрозь густыя шаты дрэў, старалася аблашчыць кожны кусцік, кветачку, травінку…

Праз гадзіну ў лесе ва ўсю кіпела жыццё. Птушкі галасіста спявалі, старанна працавалі. Вядома ж трэба ўсё паспець: дабудаваць гнёзды, адкласці яйкі, выседзець дзетак. У іх цяпер шлюбны перыяд. Яны заняты сямейнымі справамі.

Прырода, абуджаная пасля зімовага сну, набірае сілу, моц жыцця.

Я хадзіла па лесе. Шукала вузенькую сцяжынку – слядочкі майго дзяцінства. Сцяжынку, па якой з сябрамі-аднавяскоўцамі кожны дзень крочыла ў школу. Хацела пазнаць хоць адзінае дрэўца, якое вітала нас. Не, не знайшла, не пазнала. Сцяжынка зарасла кустамі і травою, дрэвы пастарэлі.
Затое здзівіла і ўзрадавала, што некалі пасаджаныя намі маленькія сасонкі выраслі. І перада мной раскінуўся духмяны, дарослы, моцны, нібы казачны асілак, сасновы бор. Усё змянілася. Дарэчы, і школы самой даўно няма. Засталіся толькі ўспаміны. На жаль, прайсціся па роднай школе, пабыць у класах, пасядзець за партай, можна толькі ў сне.

– Шукай чароўную кветку! – зноў нечакана шапнуў мне Вецер, які пралятаў над кустамі ядлоўцу.

– Знайду, знайду, не хвалюйся! – усміхнулася я і падалася глыбей у лес.

Я прыглядалася да кожнай кветачкі, кожнай травінкі, але, акрамя квітнеючай ясноткі, сон-травы, зайцавай капусты і многіх іншых лясных кветак і зёлак нічога не знаходзіла. Толькі лес яшчэ больш напаўняўся чароўнымі таямнічымі гукамі і не толькі птушынымі… Я чула, як гамоняць дрэвы паміж сабой, як цікава гутараць травы і кветкі, аб чым шапочуць майскія трапяткія далікатныя лісцікі. Усёй істотай адчувала кожную струнку прыроды, яе настрой я разумела і дзівілася. На душы ў мяне рабілася яшчэ святлей, цяплей і ўтульней ад гэтых дзівосаў яе Вялікасці Прыроды.

Доўга я яшчэ хадзіла па лесе і разгадвала яго таямніцы. І нарэшце зразумела, што знайшла чароўную кветку…

Вось яна – кветка гармоніі Душы і Цела, Неба і Зямлі, Сонца і Ветру. Кветка ўзвышаных таямнічых пачуццяў, умення тварыць і ствараць сваімі рукамі, сваім розумам. Гэта цудоўная кветка зямнога шчасця, кветка непаўторнай, непараўнальнай радасці жыцця. І я, шчаслівая, рассмяялася так гучна, што да майго смеху далучылася лясное рэха…

Я нястрымана закружылася ад цудоўнага святочнага настрою, неверагоднага душэўнага ўздыму, расставіўшы рукі, нібы маленькая дзяўчынка, пазіраючы ў Неба, дзякуючы яму за тое, што магу ўсё гэта бачыць, адчуваць і разумець.



## ХЛЕБ

Аркадзік, насупіўшыся, сядзеў на скрынцы з-пад бананаў. Ён штосьці чарціў нагою на пяску, і з-пад ілба глядзеў на сяброў, якія заядла гулялі ў футбол. Хлапчук ледзь не плакаў, так было крыўдна. І што тут такога, што ён нажом цаляў па бохану хлеба? Так добра было пападаць у мякіш! Але гэтую забаву спыніў старэйшы брат. Ён моцна накрычаў на Аркадзіка і надаваў яму па карку так, што хлопец ніколі не забудзе. Аркадзік паказаў брату язык і кінуўся наўцёкі.

"Нічога. Падрасту – адплачу яму за гэтую паддачу. За што так біць!" – абурана думаў хлопец.

– Што такі пануры сядзіш? Чаму не гуляеш? – падышоў да Аркадзіка, абапіраючыся на палачку, старэнькі дзядок Цімох.

– Нічога! – аж пачырванеў ад злосці хлопец.

– А чаго ледзь не плачаш? Чаго сапеш? Скажы, у чым справа? Можа, што параю.

Аркадзік пачаў абурацца:

– Гэта наш Руслан мне так даў па шыі, што ў мяне ажно ў вачах пацямнела і іскры пасыпаліся! Гэтага я яму ніколі не забуду! Падумаеш, у хлеб нажом цаляў! Што тут такога! У нас у класе вучні булкамі ў футбол гуляюць! Потым адны крошкі па падлозе валяюцца.

Дзед Цімох адкрыў ад здзіўлення рот. Густыя сівыя бровы папаўзлі на лоб. Ён не мог вымавіць ні слова. Хацелася не толькі даць па карку, але і паставіць на ўсю ноч на калені ў куток на грэчку, каб запомніў гэты аболтус Аркадзік, што хлеб – гэта святое! Але дзед стрымаўся.

– Хадзем, на лаўку сядзем, і я табе нешта раскажу, – прапанаваў ён.

Хлопец, неахвотна ўстаў са скрынкі і паплёўся за дзедам. Стары прыжмурыў вочы і разважліва пачаў мудрую гаворку.

– Ты, напэўна, не ведаеш, што хлеб – гэта самая вялікая каштоўнасць на свеце? Калі Хрыстос узносіўся ў неба, ён пакінуў нам хлеб, як напамін пра сябе. Хлеб – гэта Бог! Гэта самае святое! А ты па ім нажом цаляеш!

Аркадзік падняў на дзеда здзіўленыя вочы.

– Мне ніхто ніколі пра гэта не расказваў, – спалохана прамовіў ён.

– У даўнія часы хлеб у кожнай сям'і пяклі самі гаспадыні. Не так, як цяпер, у хлебапякарнях, – працягваў дзед, – дык вось, перад тым, як паставіць цеста ў печ, на ім выціскалі крыжык, як на святым дары. Тады хлеб удала выпякаўся – добра падыходзіў, быў прыгожы, пахучы і смачны, смачны! У маё дзяцінства наесціся ўволю хлеба было вялікім шчасцем! У нашай сям'і гадавалася дзесяць дзяцей. Калі мама пякла хлеб, у нас слінкі цяклі, такі непаўторны, апетытны пах разліваўся па хаце! Не маглі дачакацца, калі яна дастане з печы румяны, круглы, пышны бохан хлеба. Мама выкладвала яго на чысты белы ручнік. Хлебу была такая пашана, як самаму каштоўнаму, святому, што ёсць на свеце. І калі бохан астываў, мама перахрышчвала яго і рэзала на лустачкі.

– Як гэта перахрышчвала? – не зразумеў Аркадзік.

– Рабіла над ім знак крыжа і толькі тады рэзала. У некаторых краінах хлеб нажом не рэжуць, а ламаюць рукамі на кавалкі і ядуць. Святое, нельга рэзаць. А ты цаляеш нажом! Гулі знайшоў! Наша мама дзяліла хлеб кожнаму дзіцяці, а мы з'ядалі яго да апошняй крошачкі і дзякавалі не толькі ёй, але і Богу за тое, што накарміў нас. А калі ў каго хлеб знянацку падаў на зямлю, то той яго падымаў, цалаваў і прасіў прабачэння. Я ўсё жыццё так раблю. А вы нагамі падбіваеце, грэшнікі! – схапіўся за галаву дзед. – Бо вы, цяперашнія дзеткі, гора не бачылі. На прысмаках вырастаеце! Не ведаеце, што выдумляць! У вайну народ з голаду паміраў. Ды і да вайны, і пасля яе, калі былі неўраджайныя гады, людзі радаваліся куску хлеба. Пра блакаду Ленінграда чуў?

– Чуў, па гісторыі вучылі, – надзьмуўшыся, адказаў хлопец.

– Дык вось, падчас блакады Ленінграда людзям, якія там жылі, хлеба давалі толькі па сто грамаў у дзень. Ты толькі ўдумайся! Што такое з'есці сто грамаў хлеба ў дзень, калі яшчэ трэба працаваць і абараняць горад! Блакаднікі паміралі, стоячы ў чарзе за гэтай лустачкай. Яны золата на хлеб выменьвалі. Ты думаеш, у наш час людзі не галадаюць?

– Думаю, што не, цяпер усяго хапае, – упарта адказаў Аркадзік.

– У краінах, дзе вядуцца войны, людзі і цяпер галадаюць, – упэўнена сказаў дзед Цімох, – па тэлевізары казалі, што цяперашнім часам галадае кожны шосты жыхар зямлі. Можа, дзе і ў гэтую хвіліну дзеці прагнуць з'есці хоць кавачак хлеба. Ты ўяўляеш сабе такое?

– Не, не ўяўляю, – упіраўся хлопец, – краінам, якія ваююць, дапамагаюць харчамі іншыя краіны.

– Не, ты малы, і не так усё разумееш. А вырасціць хлеб, думаеш – лёгка? – разважаў дзед і пазіраў кудысьці ўдалечыню. – Пасеяць жыта,

вырасціць яго, перапрацаваць у муку, спячы хлеб?

– І не так цяжка! Цяпер усё машыны робяць, – упарта не згаджаўся Аркадзік, – вунь, якія нямецкія камбайны працуюць! Я нават ездзіў на такім улетку з бацькам сябра. Там такі камфорт! Кандыцыянер стаіць. Горача – уключыў сабе і працуй! Прыгажосць!

– А-а-а! Табе так здаецца, што лёгка! – зацягнуў дзед. – А каб ты пакруціў руль з самай раніцы да позняй ночы, то ведаў бы, як гэта лёгка!

Аркадзік маўчаў, мабыць, згадзіўся з дзедам.

– А цяпер скажы, ці зразумеў ты, чаму хлеб трэба берагчы і шанаваць, як самае святое? – спытаў у канцы размовы стары.

– Зразумеў, – сур'ёзна адказаў хлапчук, – хлеб – гэта Святое, а голад– гэта страшна!

Ён саскочыў з лаўкі і пусціўся дадому. Потым спыніўся, азірнуўся і крыкнуў:

– Дзякуй, дзед Цімох, за навуку! Больш не буду так рабіць!

І пабег далей. Стары з палёгкай уздыхнуў і, усміхаючыся, глядзеў услед Аркадзіку, які праз пару хвілін знік за паваротам.

Хлопчык забег у хату. Азіраючыся, зайшоў на кухню. Пакалечаны нажом хлеб так і ляжаў на стале. Дробныя крошачкі, нібы слязінкі, рассыпаліся вакол яго. Аркадзік апусціўся на калені, абняў хлеб і прытуліўся да яго шчакою:

– Прабач мне, хлябок! Прабач! Я больш не буду цябе абражаць! Я буду аберагаць і шанаваць цябе! Больш ніхто ў нашым класе не будзе гуляць табою ў футбол.



## КАСЦЁЛ УШЭСЦЯ НАЙСВЯЦЕЙШАЙ ДЗЕВЫ МАРЫІ

Караліна, Мацей, мама і тата ехалі да бабулі ў вёску. Калі яны праязджалі праз вёску Новы Двор каля старажытнага загадкавага касцёла, які ўзвышаўся за каменнай агароджай, Караліна спытала:

–Мама, заўтра ты мне раскажаш пра касцёл?

– Абавязкова раскажу, – паабяцала мама, – толькі пойдзем раней, каб да службы я змагла табе ўсё расказаць і паказаць.

– Ура! Я згодна! – узрадавалася Каралінка.

– Можна, і я з вамі? – спытаў Мацей, – мне таксама цікава ведаць пра бабулін касцёл.

– Ты яшчэ малы! – засмяялася Караліна.

– Які гэта я малы! – запярэчыў брацік. – Мне ўжо сем гадоў!

– Ну, добра, пойдзем разам! Я пажартавала! – пагадзілася сястрычка.

У нядзелю раніцай, святочна апранутыя мама, Каралінка і Мацей ішлі ў касцёл Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Па дарозе мама расказвала дзецям, як у дзяцінстве яна хадзіла ў гэты касцёл з бабуляй Казімірай і сваёй мамай. Асабліва падабалася бываць на святы. На Божае Нараджэнне дзяліліся аплаткам, на Новы год пахла ялінкамі, якія міргацелі featureрознакаляровымі агеньчыкамі, на Вялікдзень асвячалі яйкі, на Сёмуху алтары ўпрыгожвалі бярозкамі, і ў храме стаяў свежы водар маладых, клейкіх бярозавых лісточкаў. А на парафіяльнае свята – Узнясенне Дзевы Марыі, якое святкуецца 15 жніўня – у Новым Двары было незвычайна святочна. Сюды з’язджаліся ксяндзы з многіх іншых касцёлаў. Ішла працэсія, людзі спявалі святыя песні, ухвалялі Бога і Божую Маці. На такія святы каля касцёла прадаваліся розныя прысмакі: каляровае пячэнне, яркія кручаныя цукеркі, пеўнікі на палачках, а таксама абразы і іншыя рэлігійна-абрадавыя рэчы.

– Я да гэтага часу памятаю смак і водар тых ласункаў, а колькі душэўнай цеплыні захоўваюць такія ўспаміны з дзяцінства, – задумліва сказала мама.

– Касцёл наш пабудаваны вельмі даўно, у 1749 годзе, на месцы храма 1670 года. За гэты час выраслі тры пакаленні. Сюды прыходзілі маліцца вашы прабабулі, бабулі, я са сваімі равеснікамі, і вы – ужо чацвёртае пакаленне. Цікава тое, што касцёл драўляны. І не пашкодзілі яго ні навальніцы, ні завеі, ні вятры. Напэўна, прасякнуты ён божым словам, таму і трымаецца моцна. Таксама драўляная і званіца. Вунь, бачыце, чатырохвугольная пабудова каля брамы? Яна пабудавана ў 1852 годзе. Па вялікіх святах звон разліваецца па ўсёй акрузе – кліча людзей на набажэнства. З даўніх часоў людзі верылі, што касцельны звон адпужвае хваробы і выганяе злых духаў з мясцовасці.

– Вось як цікава! – пазіраючы васількавымі вачыма, дзівілася Каралінка.

– Касцёл – архітэктурны помнік, – працягвала мама, – пабудаваны прамавугольнай формай. Галоўны фасад завершаны васьміграннай вежай з крыжам.

– А прыбудовы з двух бакоў – гэта сакрысціі. Я ведаю, таму што нас бабуля выводзіць туды, калі ў касцёле горача, – дадаў Мацей.

– Так, гэта ў левую сакрысцію можна выходзіць, – усміхнулася мама, – а правая – памяшканне для ксяндза. Там ён апранае арнат*, там знаходзяцца яго святыя кнігі і ўсе неабходныя для службы рэчы.

– А цяпер пойдзем у касцёл, – сказала мама і ўзяла за рукі дзяцей. Яна павяла іх не праз бакавы ўваход, а праз асноўны, каб дзеці ўбачылі веліч, святло і непаўторную прыгажосць касцёла. Малітоўная зала выглядала,

як заўсёды, святочна. Скрозь аконную мазаіку, выкананую ў выглядзе крыжа каляровымі шкельцамі, свяціла сонца. Вецер злёгку калыхаў за вокнамі дрэвы, якія рассякалі сонечныя прамяні, і па сценах святыні скакалі вясёлкавыя зайчыкі.

Людзей было няшмат.

– Бачыце, у касцёле тры алтары, – ідучы наперад, шаптала мама, – усе яны выкананыя ў стылі ракако*. Цокаль* асноўнага алтара ўпрыгожаны пазалочанымі медальёнамі. У цэнтры размешчаны абраз “Узнясення Святой Дзевы Марыі”. Бачыце, як анёлы ўзносяць Божую Маці ў неба? А па баках скульптуры Святых Пятра і Паўла.

Дзеці з захапленнем пазіралі на абраз і прыслухоўваліся да кожнага матчынага слова.

– Верх алтара аддзелены ад асноўнага яруса крапаваным карнізам, упрыгожаны выявамі галовак херувімаў*, кароны і ваз. А пасярэдзіне абраз “Каранаванне Маці Божай”. Бачыце, як усё ўпрыгожана пазалочанай разьбой па дрэве, узорамі, арнаментамі, лісцікамі?

– Прыгожа, мне вельмі падабаецца, – прашаптала Каралінка.

– Хадзем, я раскажу вам яшчэ пра бакавыя алтары, – сказала маці.

Яны падышлі да левага алтара. З вялікага абраза на дзяцей пільна пазірала Маці Божая, якая трымала на руках свайго Святога Сына.

– Гэта абраз “Маці Божай Нястомнай Дапамогі”, – сказала мама.

Людзі моляцца да яе, каб дапамагла ў розных жыццёвых выпадках.

Каралінцы здавалася, што Маці Божая сочыць за кожным іх крокам, рухам, каб падтрымаць, падказаць і дапамагчы. І дзяўчынка ўсміхнулася ёй.

Мама ўзяла дзяцей за рукі і моўчкі павяла на другі бок.

– Гэта алтар Крыжавання Ісуса Хрыста. Сын Божы пакутаваў за нашыя грахі і памёр на крыжы, – сказала яна.

Дзеці моўчкі ўглядаліся ў кожную рысачку абраза. На алтарах стаялі букеты кветак. І па касцёле плыў непаўторны мядовы водар півоняў, салодкі лясны пах рамонкаў, чырвоных макаў і незабудкаў.

– Мама, чаму такі пах бывае толькі ў касцёлах? – спытала Каралінка.

– Таму што водар кветак змешваецца з пахам запаленых свечак, – адказала мама. – А цяпер азірніцеся назад.

Перад дзецьмі велічна ўздымаўся арган, дэкарыраваны двума драўлянымі скульптурамі анёлаў, двума херувімамі і накладной пазалочанай разьбой па дрэве ў стылі ракако.

–Гэта – арган. Музычны інструмент, – сказала мама і па драўляных сходках яна з дзецьмі падняліся на хоры.

Ля аргана сядзела маладая дзяўчына-арганістка і гартала касцельны спеўнік, рыхтавалася да імшы. Яна зірнула на дзяцей і ўсміхнулася.

– Можна, мы тут пабудзем? – папрасіля яе Караліна.

– Можна, – коратка адказала арганістка.

З высокіх хораў дзеці назіралі, як збіраюцца людзі на службу. Бабулькі ў featuredрознакаляровых квяцістых хусцінках з вышыні нагадвалі суцэльны яркі дыван, які рассцілаўся на ўвесь храм.

Меладычна зайграў арган, і арганістка пачала спяваць песню-ўхваленне Маці Божай. Яе падхапілі прыхажане. Такой чаруючай арганнай музыкі дзеці яшчэ ніколі не чулі! Дзяўчына спявала прыгожым аксамітным голасам. Каралінцы здавалася, што ёй падспеўваюць тоненькімі галасамі анёлы і херувімы, якія ўпрыгожвалі арган. А мноства нябачных анёлаў кружаць над касцельнай залай і падыгрываюць на залатых флейтах. Дзяўчынка з захапленнем глядзела на галоўны алтар – на Маці Божую. Яна адчувала сябе ў іншым свеце, а душа яе напаўнялася незразумелым дагэтуль пачуццём нечага светлага, чыстага, цёплага, пяшчотнага, узнёслага… Душа яе напаўнялася верай у Бога.



Выйшаў святар, і пачалася імша.

…Пасля службы Караліна, Мацей і мама выйшлі з касцёла. Яркае сонца паднялося над густымі верхавінамі дрэў. Дзень быў незвычайны, святочны, і настрой у дзяцей быў узнёслы.

– Мама, а там таксама касцёл? – спытаў Мацей і паказаў на пабудову, якая знаходзілася на прыгорку могілак.

– Не, гэта капліца святога Георгія (Юрыя), – адказала маці, – там спраўляюцца службы падчас пахавання і на Задушны дзень, калі памінаюць усіх памерлых. Гэта таксама архітэктурны помнік. Капліца пабудавана ў 1882 годзе.

– На ёй таксама дзве вежы, – адзначыла Караліна.

– Вялікая вежа з высокім шатром і крыжам – гэта чацверыковая званіца, пачала расказваць маці, – капліца таксама, як касцёл і званіца, пабудавана прамавугольным зрубам пад двухсхільным гонтавым дахам* з вальмай* над алтарнай часткай, якая завершана шатровай слупавай сігнатуркай (замацаваннем).

– Цікава, – задумліва сказаў Мацей.

– Так, усё, што звязана з гісторыяй цікава, – пагадзілася мама, – мы павінны ведаць гісторыю сваёй радзімы, роднага краю. Я расказала вам пра нашу спадчыну, а вы будзеце расказваць сваім дзецям.

*арнат – адзенне святара
*ракако – стыль у мастацтве і архітэктуры
*цокаль – фундамент будынка, які знаходзіцца над зямлёй
*херувім – анёл
*гонтавы дах – драўляная страха з невялікіх дошчачак
*вальма – скат шатровай страхі трохвугольнай формы

*У раздзеле **“Кошык прымавак”** я старалася адлюстраваць сэнс прымавак і прыказак, якія найчасцей сустракаюцца ў нашай мове.*

## ДЗЕ ЦЕСНА – ТАМ ПАЦЕШНА

казка

Мядзведзь, Ліса, Заяц і Воўк пабудавалі сабе хаты.

Мядзведзь вымураваў вялікі асабняк, пасадзіў сад, развёў пчол. Загарадзіў сваё падвор’е прыгожым шчыльным плотам, каб зайцы ды іншыя грызуны не пашкодзілі дрэў. Жыў ён багата, але ні з кім сваім дабром не дзяліўся, нікога ў госці не запрашаў.

Ліса таксама пабудавала сабе прыгожы дом з басейнам і тэрасай для адпачынку. Гультайкай яна была. Цэлымі днямі толькі загарала да аранжавага колеру, а працаваў Ліс. Ён хадзіў на паляванне, прыносіў з суседняй вёскі курачак, гусакоў ды іншых хатніх птушак.

І Воўк пабудаваў сабе вялікі дом. Са шматлікімі пакоямі для ваўчанят, каб жылі паасобку і не кусаліся.

А Заяц са сваёй вялікай сям’ёй жыў у невялікай сціплай хатцы. Хоць і небагата жылося, але весела. Цешыўся ён са сваіх дружных дзетак і клапатлівай жонкі. Не раз падсмейваўся з яго Мядзведзь, калі праходзіў каля зайцавай хаты.

– Ну, што гэта за будынак – павярнуцца няма дзе! – трасучыся, рагатаў ён.
– Табе няма дзе павярнуцца, а мае дзеці скачуць, гуляюць па хаце, і месца ўсім хапае! – коса пазіраў на Мядзведзя Заяц.
– Не, я ў такім жытле ні дня не жыў бы!
– Не плюй у крыніцу – прыйдзеш па вадзіцу! – мудра адказваў Касы.

Надышла восень з бурамі і навальніцамі. Аднаго разу здарылася бяда. Наляцеў моцны ўраган. Разбурыў асабняк Мядзведзя, паваліў дрэвы, а ад вулляў увогуле нічога не засталося. Лісіная хата таксама пацярпела. Ад моцнага ветру зляцела страха. У Ваўка ўраган вокны паразбіваў. А зайцава

хата як стаяла, так і стаіць. Толькі вось капусту градам пасекла. Але вясёлыя Зайцы не вельмі засмуціліся.

– Нічога, заквасім усю капусту на зіму, – супакоіла мудрая Зайчыха.

Сеў Мядзведзь на паваленае дрэва, пазірае на разваліны, а з вачэй буйныя слёзы коцяцца.

“Дзе ж я буду зімаваць?” – схапіўся за галаву, ківаючыся збоку ў бок, думае ён.

Вырашыў Касалапы пайсці да Лісы.

– Суседка, пусці мяне перазімаваць, – папрасіўся ён.

– Не, не магу! У самой, бачыш, гора – бура страху раскрыла.

– Дык я дапамагу, – прапанаваў Мядзведзь, – страху накрываць – не дом зноўку будаваць.

– Куды ж табе на страху лезці, Касалапы? Яшчэ звалішся, тады бяды з табой не абярэшся. Бяда ж не ходзіць адна, – выкруцілася Хітрая.

Згарнуўся Мядзведзь ад гора і тугі, і пашыбаваў да Ваўка.

– Шэры, пусці перазімаваць, – папрасіў ён, – хата ў цябе вялікая.

– Ды што ты?! Мы з табой пад адной страхой ніколі не ўжывёмся! Мае дзеці выць будуць, калі ты зімою храпсці будзеш на ўсю хату, – адказаў Воўк.

Тут Мядзведзь ужо і лапы апусціў, але з-пад куста выскачыў вясёлы Заяц. Паглядзеў на сумнага Мядзведзя і кажа:

– Што, Касалапы, зіма надыходзіць? Разумею я цябе – без жытла замерзнеш, загінеш.

– Так, – змахнуў слязу Мядзведзь.

– Не плач, слязамі гору не дапаможаш. Хадзем да мяне, перазімуеш. Пакладу цябе ў вялікім пакоі – будзеш спаць усю зіму ды лапу смактаць.

– Цесна ў цябе, Зай, – зірнуў на зайца вінаватымі вачыма Мядзведзь.

– Дзе цесна – там пацешна! – падскочыў Касы. – Хадзем!

– Дзякуй, Заяц, вясёлы ты ды яшчэ добры!

– Свет не без добрых Зайцоў! – падміргнуў Касы.

## БЕЗ НАВУКІ І ЛАПЦЯ НЕ СПЛЯЦЕШ

казка

Аднаго разу бусел Даўгадзюб вырашыў навучыць сваіх дзяцей гнёзды будаваць.

– Гняздо буслоў называецца буслянкай, – сказаў бацька. – Па-першае, трэба выбраць моцнае высокае дрэва, слупак або вежу. Каб у непагоду надзейна трымалася, і каб ворагі не дасталі.

Двое сыноў уважліва слухалі бацьку, а трэці, самы малодшы Белакрылік, разлёгся на буслянцы, нагу на нагу закінуў і пазіраў у блакітнае неба.

– Слухай уважліва, сынок, – зрабіў заўвагу яму Даўгадзюб, – і пазірай, як я буду рабіць.

– Навошта! Гэта ж так проста, гняздо збудаваць! – адказаў сын.
– Ну, дык можа ты растлумачыш і пакажаш, як будаваць буслянку?
– І пакажу! – адразу спахапіўся Белакрылік. – Паляцелі за мной!

Ён важна ўзняўся ў паднябессе. Хуценька прыгледзеў старое дрэва, якое ад ветру калыхалася і сказаў:

– Вось тут і пабудую.

Бацька і браты назіралі з вышыні, як працуе буслік і моўчкі ўсміхаліся. А Белакрылік насіў галінкі і, абы як, укладваў іх кругам. Потым паляцеў да чалавечага жытла, назбіраў розных анучак, у лесе схапіў моху і занёс на гняздо.

– Вось і ўсё! – важна сказаў ён. – Ляціце да мяне! – І сам апусціўся на буслянку.

Але што гэта? Яго ногі праваліліся скрозь галлё. Ён спрабаваў вызваліцца, але не атрымалася. Буслік біўся крыламі, і яго ногі яшчэ больш застрагвалі ў шчылінах.

– Дапамажыце! – крыкнуў Белакрылік. – Ратуйце!

На дапамогу яму прыляцелі бацька і браты. Яны выцягнулі бусліка з галля і апусціліся на зямлю.

– Што ж! – падняў угору крыло Даўгадзюб і зірнуў на Белакрыліка. – Не хацеў ты, каб я навучыў, дык вось табе і вынік. Без навукі і лапця не сплящеш, а ты хацеў жыллё пабудаваць!

Буслік ад сораму апусціў галаву і засунуў дзюбу пад крыло.

– Век жыві і век вучыся! Зразумеў?
– Зразумеў… – прабурчаў Белакрылік.

## КАЛІ КАЖУЦЬ ”НЕ”, ДЫК ХОЧАЦЦА ЎДВАЙНЕ

казка

Мудрая клапатлівая Вавёрка жыла са сваімі дзеткамі ў дупле на высокім дрэве.

Аднойчы сабралася яна па арэхі, а дзецям, дачушцы Весялушцы і сыночку Шустрыку, загадала сядзець дома ціха, на вуліцу не вылазіць, дзверы не адчыняць, каб не залезла Куніца.

– Ты, Весялушка, як сабе хочаш, – сказаў Шустрык, калі яны засталіся адны, – а мне дык хочацца паскакаць па дрэвах, паглядзець на лясныя дзівосы. Я ўжо вялікі і вельмі шустры. Калі што – уцяку ад Куніцы.

– Нікуды нават не збірайся! – запярэчыла Весялушка. – У лесе столькі Куніц! Яны цябе зловяць!

– Не зловяць! Я буду асцярожны. Яшчэ я хачу сам назбіраць грыбоў і парадаваць маму. А ты дзверы не зачыняй. Я, калі буду ўцякаць – хуценька ўскочу ў дупло і Куніца мяне не зловіць.

Шустрык зірнуў уніз. Яму яшчэ больш захацелася на волю! І ён скочыў за дзверы.

– Шустрык! Ты куды?! – крыкнула сястрычка.

Але брацік толькі хвосцік паказаў і знік сярод незлічоных галінак.

“Калі кажуць “не”, дык хочацца ўдвайне, – зморшчыўшы мордачку, падумала ваверка, – я таксама хачу пагуляць, мне адной сумна сядзець. Ды пакуль мама вернецца, мы з Шустрыкам будзем ужо дома, і яна нават не здагадаецца, што мы гулялі без яе дазволу”.

І Весялушка з галінкі на галінку паскакала ўніз. Навастрыла вушкі, прыслухоўвалася да кожнага шолаху, каб не сустрэцца з ворагамі. І тут ваверка ўбачыла брацiка, які з усяе сілы ўцякаў ад варожай Куніцы.

– Шустрык, скачы на дрэва! – толькі і паспела крыкнуць сястрычка, калі ён, нібы вецер, пранёсся каля яе.

Але брацік не паспеў уцячы. Куніца схапіла яго зубамі і павалакла ў глыб лесу.

– Ай-ай-ай! – заплакала Весялушка. – Што ж цяпер будзе?! Як выратаваць Шустрыка?!

– Чаго ты плачаш, ваверачка? – пачула яна тоненькі галасок.

Весялушка здзіўлена азірнулася і ўбачыла ў траве сярод кветак маленькага Эльфа.

– Куніца злавіла майго брацiка Шустрыка. Як яго цяпер выратаваць, калі я не ведаю нават, дзе яна жыве? – усхліпвала ваверачка.

– Не хвалюйся, я табе дапамагу, – супакоіў яе Эльф. – Вось табе шышка, куды яна пакоціцца – туды і скачы. Але адна не рызыкуй. Сабяры сяброў і тады адпраўляйся на пошукі Шустрыка, – параіў Эльф і знік так жа імгненна, як і з’явіўся.

– Дзякуй, Эльф! – выцерла слёзкі Весялушка і сціснула ў лапках шышку.

Яна хутка памчалася па дрэвах клікаць сяброў на дапамогу. І калі цэлая армія была сабрана, ваверка кінула на зямлю чароўную шышку. Яна пакацілася ўперад, паказваючы шлях да Куніцы. Ваверкі, зайцы, вожыкі, барсукі нечакана напалі на зладзейку Куніцу і выратавалі Шустрыка.

– Дзякуй, што выратавалі! Сапраўдныя сябры ў няшчасці пазнаюцца, – вінавата ўсміхнуўся Шустрык.

– Усё добра тое, што добра канчаецца! – папракнула яго Весялушка. – А магла б Куніца цябе з’есці, каб мы не паспелі ў патрэбны час!

## ЛЕПШ СТО СЯБРОЎ, ЧЫМ СТО РУБЛЁЎ

казка

Захацелася Дзятлу разбагацець. Надакучыла яму лічыць дробязь. Вельмі ж хацелася пажыць багата, пабываць у іншых краінах, адпачыць на лепшых курортах свету. Вырашыў ён стаць прадпрымальнікам.

“Буду дуплы рамантаваць, гнёзды птушкам будаваць і прадаваць. Гэта самая выгадная справа,” – думаў ён.

З ранку да вечара працаваў Дзяцел – выдзёўбваў на дрэвах дуплы, аздабляў прыгожа і прадаваў. І справа пайшла як па масле. Не паспее ён адно гняздо прадаць, як на другое ёсць пакупнік. Хутка разбагацеў

прадпрымальнік, радуецца, грошы па дробязі не лічыць, ганарлівы стаў, дзюбу задраў. Ні з кім нават не вітаецца, не тое што сябруе. Як кажуць, “без дулі ні да носа!” Мары яго збыліся: адпачывае на курортах, па морах-акіянах плавае. Яхту сабе прыдбаў.

Але аднойчы здарылася бяда. Зламаў Дзяцел сабе дзюбу, а гэта – яго асноўная прылада працы. Засмучаны і пакалечаны, паляцеў ён да лясной лекаркі Савы. Прыляцеў і нават паскардзіцца не можа, бо замест голасу – сіпата. Але мудрая Сава ўсё зразумела і без слоў.

– Трэба пратэз за мяжою заказваць, – сказала яна і паклала Дзятла ў свой шпіталь. Ляжыць ён, сумуе і гаруе. Справа спынілася. Грошы не капаюць. Ніхто да яго не наведваецца, няма каму кроплю вады падаць.

– Дзяцел дзюбу зламаў! Дзяцел дзюбу зламаў! У шпіталі ляжыць! – аднойчы разнесла па лесе на хвасце Сарока.

Вырашыла Сінічка наведаць суседа Дзятла. Прыляцела яна і бачыць – ляжыць знямоглы багаты прадпрымацель з забінтаванай дзюбай, схуднеў без вады і яды.

– Бачыш, родненькі, – гаворыць яму Сінічка, – і багацце тваё тут не дапамагае. Не сябраваў ты ні з кім, толькі грошы лічыў і ў панчошку складваў. Забыліся ўсе пра цябе. А лепш, каб было ў цябе сто сяброў, чым сто рублёў.

Накарміла, напаіла добрая Сінічка суседа, цвыркнула і паляцела.

## НЕ ПЕРАСКОЧЫЎ, НЕ КАЖЫ “ГОП”

казка

Хваліўся неяк заяц Куцахвосты перад звярамі-адналяскоўцамі:

– Я хутка буду самы багаты ў нашым лесе! Вось пабачыце: хату сабе пабудую на зайздрасць вам усім! Катэдж вымурую, як ні ў кога! “Велік” горны куплю! Нікому не дам праехацца! А яшчэ машыну самую дарагую хачу! “Каб на базар агародніну вазіць прадаваць,” – ледзь не вырвалася ў зайца, але ў патрэбны час спыніўся, таму што выдаў бы сваю таямніцу.

– Глядзі, Куцахвосты, каб ад тваіх задумак хвост твой зусім не адваліўся. Ці за тваю хвальбу яго яшчэ больш не абскубалі! – падсмяяў зайца Воўк, які сам пры кожнай сустрэчы стараўся пацягаць касога за хвост.

– Не бойся! – ажно пачырванеў ад злосці заяц, што зноў пра хвост нагадалі, – яшчэ прыйдзеш да мяне і папросіш, каб падвёз цябе на машыне!

А задумаў заяц увесь свой велізарны агарод засадзіць-засеяць агароднінай, восенню прадаць на базары, а за выручаныя горшы набыць усё, аб чым марыў. Добра пайшлі ў яго справы: стараўся, працаваў, і задумка здзейснілася б, але надвор’е не спрыяла. Чэрвень выдаўся мокры. Бязлітасна лілі дажджы, а ў ліпені так сонца смаліла, што ўсё павысыхала. Бедны заяц пачаў сумаваць. Што тут пра багацце думаць, калі нават запасаў на зіму не збярэш. “Аблом” атрымліваецца, а так хваліўся, што разбагацее. Сорамна зрабілася касому. На вуліцу нават за свой плот не выскоквае. Думаюць звяры, куды ж гэта заяц прапаў?

Падышоў аднойчы да зайцавага плоту Вожык ды падглядвае праз шчылінку.

– Што ты тут, Калючы, выглядаеш? – падскочыла да яго Вавёрка.

– Нешта Куцахвостага не бачна. Нават хвост на вуліцу не паказвае. Можа, клад на агародзе знайшоў, бо так хваліўся, што разбагацее праз лета.

– Пачакай, яшчэ не восень! – адказала Вавёрка. – Але ж і сонца смаліць, але ж і спёка! – абмахваючыся пушыстым хвастом, уздыхнула яна і паскала на свой падворак у цянёк.

Надышла восень. Чакаюць звяры, калі за старым зайцавым плотам асабняк уздымецца, ды Куцахвосты выедзе на шыкоўнай машыне ці на горным веласіпедзе, або, нарэшце, хаця б на ролікавых каньках. Не могуць дачакацца. А заяц сядзіць і бядуе каля хаты, галаву лапамі падпёр, вушы на плечы апусціў.

Прыляцеў да яго Верабей, сеў на галінку яблыні.

– Не сумуй, Куцахвосты, карэньчыкамі ды карой узімку пераб'ешся. Бачыш, год вісакосны: калі не высушыць, дык вымачыць. А гэты год – і высушыў, і вымачыў! А на будучае памятай, каб з цябе звяры не смяяліся: не пераскочыў, не кажы "гоп"! Гэта я наконт тваіх грандыёзных планаў, – параіў Верабей, цвыркнуў і паляцеў далей.

## КОЖНАЙ СЯСТРЫЦЫ – ПА ЗАВУШНІЦЫ

Было ў бацькі пяць дочак – Арына, Аліна, Марына, Ілона і самая малодшая Алёна. Аднаго разу паспрачаліся сястрычкі паміж сабой.

– Мяне тата любіць больш за ўсіх! – з выклікам сказала Ілона.

– І адкуль ты гэта ведаеш? – насцярожана спытала Аліна.

– Таму што заўсёды купляе мне ўсё, што папрашу.

– Ну і што! – усклікнула Арына. – І мне ён усё купляе. А любіць мяне, сапраўды, больш, чым вас усіх! Таму што заўсёды мяне падтрымлівае, дае парады. Толькі з ім я магу падзяліцца сваімі сакрэтамі.

– Ну і што! І я ўсё давяраю тату. І мне ён дае добрыя парады, – абуралася Марына.

– Мяне тата любіць больш за ўсіх вас, – раўніва адазвалася маленькая Алёнка, – ён заўсёды купляе мне прысмакі і цацкі. І на руках мяне носіць!

– І нам купляе! – амаль у адзін голас усклікнулі чатыры старэйшыя сястры. – А на руках цябе носіць, таму што ты яшчэ маленькая!

Аднойчы паехаў бацька ў далёкую краіну і надоўга. Вельмі сумавалі па ім дачушкі. Не хапала бацькавых падказак, парад, суцяшальных слоў… Чакалі з нецярпеннем дзяўчынкі, калі ён вернецца.

І вось нарэшце прыехаў бацька дадому. Любыя дачушкі кінуліся да яго ў абдымкі – не маглі нарадавацца, нацешыцца. І калі хваля цёплай сустрэчы крыху адступіла, бацька сказаў:

– Мілыя дочачкі, я прывёз вам падарункі. – І ён уручыў кожнай дзяўчынцы па аднолькавай аксамітнай скрыначцы.

– Кожнай сястрыцы – па завушніцы, – цёпла ўсміхнуўся бацька.
Сястрычкі адкрылі скрыначкі і ахнулі. Ва ўсіх аказаліся аднолькавыя залатыя завушніцы, з дробненькімі вочкамі-дыяментамі, якія пераліваліся праменьчыкамі шчырай татавай любові да сваіх дачушак.

– А чаму ўсім аднолькавыя падарункі? – ад нечаканасці спытала старэйшая дачка Арына.

– Таму што ўсіх вас, дачушкі, люблю аднолькава! – з пяшчотнымі іскрынкамі ў вачах адказаў тата.

## БЕЛЫЯ РУЧКІ ЧУЖУЮ ПРАЦУ ЛЮБЯЦЬ

Алёнка прыехала да бабулі ў вёску на летнія канікулы. Дзяўчынка цэлымі днямі бавілася з сяброўкамі на рэчцы, любіла катацца на веласіпедзе ў парку, а раніцай доўга спала. Бабуля не магла дачакацца, каб унучка дапамагла ёй што-небудзь зрабіць па хатніх справах. А працы ў бабулі было даволі: і агарод прапалоць трэба, і ў хаце прыбраць і сена дапамагчы дзеду прасушыць.

– Гарадская ты ў мяне. Не любіш працаваць, – папракала Алёнку бабуля, – а дарэмна. Працу трэба любіць. Яна загартоўвае, робіць людзей моцнымі і дужымі. А ты толькі ля камп’ютара не лянуешся сядзець і каля люстэрка выкручвацца. Магла б і дапамагчы мне што-небудзь.

– Ай, потым рукі брудныя будуць, не адмыць, – адказвала дзяўчынка.

А самой шкада станавілася бабулі. Старэнькая яна, слабенькая.

Аднойчы бабуля палола на агародзе градкі. Прыбегла да яе Алёнка і пытае:

– Бабулечка, можа дапамагчы табе?

– Дык ты ж свае далікатныя ручкі выпацкаеш. Паглядзі, якія ў мяне брудныя. І твае такія будуць. У цябе вунь гладзенькія, маладзенькія, беленькія ручкі… Але найгорш, што яны чужую працу любяць, – сказала бабуля.

Унучка зірнула на зморшчаныя, вузлаватыя ад працы і старасці бабуліны рукі і зразумела, што яе рукі сапраўды любяць працу старэнькай бабулі, якая корміць яе, мые адзежу. І дзяўчынцы зрабілася сорамна. Яна прысела і пачала дапамагаць палоць.

## НЕ ЎСЁ ТОЕ ЗОЛАТА, ШТО БЛІШЧЫЦЬ

Віця Рамонкаў сядзеў на ўроку беларускай літаратуры. Хлопчык не слухаў, аб чым расказвала настаўніца. Ён зачаравана пазіраў на аднакласніцу Ганку. Яму даўно падабалася гэтая прыгожая дзяўчынка. А сёння яна была асаблівай – вачэй не адарваць! Яе доўгія валасы былі сабраныя вялікім прыгожым бантам у шыкоўны кучаравы хвост. Ганка самая прыгожая дзяўчынка ў класе. І вучыцца яна выдатна, удзельнічае ў мерапрыемствах

класа, бывае вядучай на школьных ранішніках. Не аднаму Віцьку падабаецца дзяўчынка. Нават хлапчукі з іншых класаў захапляюцца дзяўчынкай-прыгажуняй. Ганка аб гэтым ведае, таму і ходзіць заўсёды з ганарліва паднятай галавой, фыркае на ўсіх.

Аднойчы Віця купіў у школьным буфеце шакаладку і пасля заняткаў нерашуча падышоў да аднакласніцы.

– Гэта табе, – прамовіў ён і пачырванеў.



– Яшчэ чаго! Я не люблю шакалад! – фанабэрыста адказала Ганка і зірнула на Віцьку так, што шакаладка выпала ў яго з рук.

– Можна, я цябе дадому падвяду, ранец паднясу? – не адступаў Віця.

– Адчапіся, Рамонак! – адрэзала дзяўчынка, схапіла свой ранец і выбегла з класа.

Віця апусціў галаву і паплёўся ўслед за аднакласніцай. Па дарозе ён думаў, што б такое зрабіць, каб Ганка звярнула на яго ўвагу?

“Вось бы яна ў рэчку ўпала, а я яе выратаваў, – думаў хлопец, – каб на яе сабака напаў, а я яе абараніў бы. Не, сабак я і сам баюся. Вось каб яна ў лужыну ўпала, а я б дапамог ёй падняцца і дадому дабрацца. Не, ад смеху я і сам у лужыну ўпаў бы.”

Віця думаў, але патрэбныя думкі ў галаву не прыходзілі. Так ён зайшоў у сваю кватэру, распрануўся і сеў за стол.

– Е-е-ес! Прыдумаў! Клас! – ускочыў хлопец, выставіўшы ўперад два пальцы. – Я напішу ёй верш! Дзяўчынкі любяць, калі ім прысвячаюць вершы! І ён пачаў у думках рыфмаваць словы: “Ганка – палянка”, “Ганка – падманка”, “Ганка – шарманка”, “Ганулька – бабулька”, “Ганулька – шыпулька”…

– Не, усё не тое! Усё не так! – спыніў сам сябе Віця.

Ён адкрыў слоўнікі, даведнікі, шукаў прыгожыя словы. Доўга складваў-выдумваў. І нарэшце ў яго атрымаўся сапраўдны верш:

Жыве на нашай вуліцы

прыгожая дзяўчынка.
Як знічкі яе вочкі,
а вусны, як малінкі.
Спявае яна песенькі
срабрыстым галаском,
і з жартаўлівым сонечным
гуляе прамянём.
І з ветрыкам ласкавым
смяецца і танцуе…
ды толькі вось Ганулька
са мною не сябруе!

Віцька зіхацеў ад шчасця за свае паэтычныя здольнасці. Яму не цярпелася хутчэй падарыць верш аднакласніцы. Ды каб ніхто больш не чуў, акрамя яе. Але дзяўчынка заўсёды была з сяброўкамі.

Вырашыў хлопчык пачакаць яе каля пад'езду. Доўга стаяў, чакаў. І вось яна, Ганначка! Дзяўчынка ішла са сваім малодшым брацікам, якога трымала за ручку, а той чамусьці плакаў. Віця, саромеючыся падышоў да іх і прамовіў:

– Ганка, я прысвяціў табе верш…
– Верш?! – здзівілася дзяўчынка. – Я люблю вершы!
– Вось паслухай… – пачаў Віцька.

Але дзяўчынка яго перабіла. Яна трэсла за плечы браціка, перакасіўшыся ад злосці і крычала:

– Ды не раві, ты! Заціхні! Змоўкні! Дай паслухаць! Мала дастаў, яшчэ хочаш?!

Брацік заплакаў яшчэ мацней, а Віця аслупянеў. Ён здзіўлена глядзеў на прыгажуню. Яна падалася яму зусім непрыгожай, нават непрывабнай.

"Не ўсё тое золата, што блішчыць!" – падумаў хлопец.

Яму захацелася моцна тузануць дзяўчынку за касу, але замест гэтага Віця крыкнуў:

– Не падыходзьце да Ганулькі! Яна калючая шыпулька! – І, не азіраючыся, пабег са двара.
– Гэта такі верш?! – збянтэжана міргала доўгімі павейкамі дзяўчынка.

## ШТО ГАЛАВА, ТО РОЗУМ

Сярод адзінаццатых класаў школ горада Гродна аб'явілі конкурс на лепшую мадэль радыёўпраўляльнага лятальнага апарата. Па ўмовах конкурсу будуць вызначаны тры прызавыя месцы. У пераможцаў будзе магчымасць паступаць у Гродзенскі ўніверсітэт імя Я. Купалы без уступных экзаменаў на факультэт фізікі.

І вучні з запалам узяліся за канструіраванне. Яны прыдумвалі розныя канструкцыі апаратаў, паялі, падключалі правады, фарбавалі… Кожнаму

хацелася стаць пераможцам, прадставіць камісіі што-небудзь незвычайнае, арыгінальнае.

Надышоў дзень запуску лятальных апаратаў. Першым прадставіў сваю працу Аляксей Хітрушка. Ён не раз быў пераможцам на абласных і рэспубліканскіх алімпіядах па фізіцы і матэматыцы. І тут хлопец паказаў выдатныя веды не толькі фізікі, але і сапраўднае мастацкае майстэрства. Ён прыдумаў “лятальную талерку”. Аляксей спаяў дзве бліскучыя сталовыя міскі – атрымаўся корпус. Прасвідраваў круглыя адтуліны, замацаваў туды лямпачкі і падключыў іх да батарэек. Хлопец вельмі хваляваўся, каб апарат узляцеў – не даў асечкі. Ён дрыжачай рукою націснуў на кнопку – і “талерка” ўзнялася ў паветра. Апарат ляцеў, міргаючы лямпачкамі, то павольна, то свішчучы, набіраў хуткасць. Потым рэзка спускаўся ці падымаўся. Так лятаюць НЛА. Хлопец чытаў пра іх у кнігах і часопісах па ўфалогіі.

– Цудоўна! – апладзіравалі прысутныя. – Малайчына!

– Выдатная праца, – пахваліў дэкан факультэта фізікі ўніверсітэта, які быў галоўным суддзёю конкурсу.

– Малайчына, Алёша, відаць, што стараўся! – радаваўся за свайго вучня настаўнік фізікі Павел Юр’евіч.

Наступны вучань сканструіраваў самалёт авіетку, які таксама без асечак узляцеў. І гэты апарат вельмі спадабаўся журы. Міхась Арлоў запусціў касмічную ракету. Яўген Мароз узняў у паветра ваенны самалёт. Вучні паказалі выдатныя веды фізікі, а таксама кемлівасць. Гэта тычылася падключэння правадоў, узлётнай асаблівасці апаратаў і прыгожага афармлення.

– Што галава, то розум, – радаваўся дырэктар сярэдняй школы №77 Арцём Ігнатавіч.

– Разумныя галовы! – пагадзіўся з ім Павел Юр’евіч, – малайцы, нікога не падвёў апарат. Відаць, што працавалі дакладна.

– Такога відовішча не было яшчэ ў нашым горадзе, – пахвальна адгукнуўся начальнік адукацыі гарвыканкама Яўхім Назаравіч, – разумнікі фізікі.

Нарэшце былі падведзены вынікі конкурсу. Трое пераможцаў атрымалі дыпломы і сертыфікаты, якія сведчылі, што яны залічаны на першы курс фізічнага факультэта ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Астатнія вучні атрымалі пахвальныя граматы і памятныя падарункі.

## КІНЕШ ЗА САБОЮ – ЗНОЙДЗЕШ ПЕРАД САБОЮ

– Чаму ты сёння такі сумны? – спытаў на перапынку Арцём у Алега.

– Пенал новы згубіў, нядаўна купілі. Ён мне так падабаўся. Там былі два раздзелы. У адным ляжалі ўсе прылады: лінейка, аловак, гумка, транспарцір, а ў другім – фламастары і каляровыя алоўкі. Прыгожы такі быў, на вокладках намаляваны гоначныя машыны – мая мара. Як зірну на іх, дык вучыцца лепш хацелася. Такога пенала ў мне больш не будзе.

– Зразумела, шкада, – спачуваў Арцём, – а можа, у цябе яго ўкралі?
– Не ведаю, але пенала ў мяне больш няма, – сумна адказаў Алег.

На наступны дзень на занятках Арцём падышоў да Алега.

– Трымай, гэта табе, – ён усміхнуўся і працягнуў Алегу новы пенал. Такі ж самы, як і прапаў, толькі колер і машынкі іншыя.

– Не, не вазьму, – разгубіўся Алег і пачырванеў ад неспадзянкі.

– Бяры, не сумнявайся, у мяне два аднолькавыя. Адзін мама з татам купілі, а другі бабуля падарыла. Мне не шкада, я табе яго дару.

– Чым жа я табе аддзякую? Што мне табе падарыць?

– А мне нічога не трэба. У мяне ўсё ёсць.

– Тады вялікі дзякуй, – зірнуў ўдзячнымі вачыма Алег на сябра.

Ішоў час. Навучальны год быў у самым разгары. Алег вучыўся добра. Усе дысцыпліны яму даваліся лёгка. А вось Арцём не ўсе тэмы разумеў па матэматыцы, ды і руская мова ў яго “кульгала”. Алег гэта заўважыў і аднойчы прапанаваў сябру:

– Хочаш, дапамагу табе разабрацца ў незразумелых тэмах па матэматыцы і рускай мове. Бачу, што ў цябе з імі праблемы.

– Хачу, – сумеўся Арцём. – Я думаў, каб каго папрасіць аб гэтым, але ж не кожны захоча траціць свой вольны час на мяне.

– Во, дзівак, я з задавальненнем дапамагу табе па прадметах, якія не разумееш! – радасна адказаў Алег, – ты ж не пашкадаваў для мяне пенал, а я не пашкадую свайго вольнага часу для цябе. За дабро дабром трэба плаціць. Ці як там кажуць: “Кінеш за сабою – знойдзеш перад сабою”. Ну што, згодзен? – працягнуў хлопчык сябру руку.

– Згодзен, – паціснуў Арцём руку Алегу.

## КІНЕШ ПЕРАД САБОЮ – ЗНОЙДЗЕШ ЗА САБОЮ

– Дзед, як зразумець прыказку “Кінеш перад сабою – знойдзеш за сабою”? – задумліва пытаецца Арцём. – Нам назаўтра трэба знайсці тлумачэнне да гэтай прыказкі. – Я разумею – “Кінеш за сабою – знайдзеш перад сабою”. Аднойчы я падарыў сябру пенал, а ён мне потым растлумачыў незразумелыя тэмы па матэматыцы і рускай мове.

Дзед Язэп моўчкі ўстаў з ложка, апрануў сюртук, начапіў на галаву шапку, задумліва пахадзіў па хаце і зірнуў у акно.

– Пойдзеш са мной? – нарэшце спытаў ён.

– Куды?

– Прыказку патлумачу.

Арцём паслухмяна апрануўся і яны выйшлі з хаты. Ласкава прыгравала вясновае сонца, з травы пазіралі жоўтымі вочкамі першыя дзьмухаўцы. На ўсе лады выводзілі свае рулады шпакі.

– Час сеяць, а за адно, паказаць табе, што можна кінуць перад сабою, а знайсці за сабою, – сказаў дзед і зірнуў удалечыню.

Ён зайшоў у хлеў, узяў прыстасаванне для сяўбы, торбу з зернем і накіраваўся за вёску. Арцём не адставаў.

Хутка яны прыйшлі на поле.

– Ну, што будзеш мне дапамагаць? – спытаў дзед.

– Буду, калі дазволіш? – адказаў унук. – Толькі скажы, што сеяць будзем?

– Авёс. Ты ж ведаеш, што аўсяная каша не толькі смачная, але і карысная? А пячэнне з аўсянай мукі любіш?

– Люблю, мне бабуля заўсёды яго купляе, – усміхнуўся ўнук.

Дзед Язэп паставіў торбу і набраў у прыгаршчы зямлі.

– Зямелька-карміліца, каб радзіла, – прашаптаў ён і сыпануў яе на раллю.

Потым перакінуў праз плячо прыстасаванне для сяўбы і пачаў сеяць. Ён браў жменю зерня і з размаху рассыпаў перад сабою.

– Бяры, Арцём, і ты вучыся, – сказаў дзед.

Хлопчык паглядваў на дзеда і стараўся сеяць так, як ён. У небе весла спявалі жаўрукі. Іх пераліўчатыя песні срэбранымі званочкамі разліваліся па ўсёй акрузе. Вясна крочыла поўным ходам. А дзед з Арцёмам крочылі па раллі і кідалі перад сабою зерне.

Калі праца была зроблена, дзед спытаў:

– Вось, бачыш, кінулі перад сабою цяпер, а знойдзем за сабою калі?

– У жніўні, – упэўнена адказаў хлопчык. – Во, здорава! Я і сеяць навучыўся, і прыказку зразумеў, – узрадавана дадаў ён.

– Дарэчы, чаму месяц жнівень так называюць? – спытаў дзед Язэп.

– Таму што ў гэтым месяцы жнуць. І мы будзем жаць авёс, – адказаў Арцём.

– Усё правільна, – усміхнуўся дзед, – малайчына, ўнучак, кемлівы ты ў мяне. Няхай толькі ўродзіць наш авёс. Будзем жаць.

# ТВОРЫ З КНІГІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ “КАЗКІ-ЧАМУЧКІ”

## ЧАМУ ВАСІЛЁК ЖЫВЕ Ў ЖЫЦЕ

**казка**

Адзінокі Васілёк жыў на бульбяным полі. Быў ён нябеснай прыгажосці, але вельмі слабенькі, кволенькі. Яго тоненькая з дробнымі лісцікамі сцяблінка, здавалася, вось-вось зламаецца. Васілёк вельмі баяўся моцных вятроў і навальніц. У непагадзь беднай кветачцы не было куды схавацца. У сініх вочках адлюстроўваўся жах за сваё жыццё. Васілёк заўсёды радаваўся Сонцу, прыветліва ўсміхаўся яму. А яно лашчыла кветку, грэла і надавала сілы. Бульба і трава, сярод якіх рос Васілёк, не любілі яго. Таму на душы ў кветкі было заўсёды маркотна.

Аднойчы пайшоў моцны дождж. Буйныя кроплі падалі на зямлю. Яны з усяе сілы білі Васілька па сцяблінцы, калечылі яго далікатныя лісцікі. Кветачка не ведала, куды схавацца, як выратавацца. Бульбяныя кветкі схавалі свае галоўкі пад шырокае лісце. Іншыя расліны таксама схаваліся – хто куды змог. Адзін Васілёк быў бездапаможны.

Скончылася навальніца. Цёмныя хмары разагнаў клапатлівы Вецер. Кветкі пачалі выбірацца са сваіх схованак: падымалі галоўкі, абтрасалі кроплі з лісцікаў. На зямлю зірнула Сонца. Яно абвяло навокал вачыма і не заўважыла любімага Васілька. Тады Сонца папрасіла свайго Праменьчыка, каб адшукаў яго. Праменьчык хутка знайшоў кветку. Пабіты, пакалечаны дажджом Васілёк нерухома ляжаў у траве. Ласкавы Праменьчык пагладзіў яго па сініх пялёстках і расправіў лісцікі, якія яшчэ засталіся на сцяблінцы.

– Жыць… жыць… я хачу жыць.., – прастагнаў бездапаможны Васілёк.

Тады Праменьчык кінуўся шукаць Ветрыка, які гарэзліва гуляў сярод духмяных рамонкаў і пунсовых макаў. Ён падбадзёрваў іх пасля навальніцы, здзьмухваў з іх апошнія цяжкія кроплі. Праменьчык расказаў Ветрыку пра параненага Васілька, і яны памчаліся на дапамогу.

Праз некаторы час, Ветрык з Праменьчыкамсхіліліся над кветкай. Яны зноў пачулі стогн:

– Жыць… жыць…

– Бедны паранены Васілёк! – саграваў кветку Праменьчык.

– Трэба яе перасяліць у жыта, – адразу прапанаваў кемлівы Ветрык. – Жыта – гэта ж жыць, гэта азначае жыццё. А Васільку так хочацца жыць. Жыта будзе яго падтрымліваць, надасць сілы. Яму будзе ўтульна, надзейна і цёпла. Я ведаю гэта, бо заўсёды лётаю над жытам і вельмі люблю калыхаць залатыя каласкі, або назіраць як плыве жітнёвае поле вялікай суцэльнай хваляй.

Праменьчык і Ветрык перасялілі Васілька ў жыта.

– Якая прыгожая кветка!

– Няўжо яна будзе жыць сярод нас?!

– А вочкі, як неба!

– А сцяблінка – тоненькая, далікатная! – шапацелі-дзівіліся прыветлівыя жытнія Каласкі.

– Як цябе завуць, кветачка?

– Васілёк, – сціпла адказала кветка і зірнула сумнымі вочкамі.

– Якое цудоўнае імя – Васілёк! – зачароўваліся залатыя Каласкі. – Ты

будзеш упрыгожваць наша поле.  Мы будзем цябе шанаваць і берагчы. Мы ж не звычайныя, а жытнія каласкі!  Жыта – гэта хлеб, без якога немагчыма жыццё. Ты ніколі не пашкадуеш, што пасяліўся сярод нас, – віталі кветку добразычлівыя Каласы.



Слабенькі, паранены Васілёк здзіўлена пазіраў на іх.Цудоўныя цёплыя словы падбадзёрылі яго, надалі сілы і яму яшчэ больш захацелася жыць, жыць сярод душэўных хлебных Калоскоў.

Праменьчык з Ветрыкам пазіралі і цешыліся, што зрабілі такую добрую справу.

З кожным днём Васілёк набіраўся жыццёвай сілы. Прыемна было жыць сярод клапатлівых сяброў-Каласкоў, якія напаўнялі яго чыстай  светлай жыццёвай  энергіяй.  Цяпер ён не баяўся моцных вятроў і навальніц, таму што сам стаў моцным і дужым.

З таго часу сціплы сіні васілёк жыве ў жыце, сябруе з прыветлівымі каласамі, слухае вясёлыя звонкія песні жаўрука, гуляе з цёплымі сонечнымі праменьчыкамі і бадзёрым ветрыкам, падміргвае  блакітнымі вочкамі людзям і радуецца жыццю.

## ЧАМУ ЗЯЗЮЛЯ ЖЫВЕ Ў ХОДЗІКАХ

Хадзіў па лесе Чарадзей. Сустрэўся ён з лясным Дзятлам. Запрасіў той Чарадзея ў госці і ветліва частаваў яго ў сваёй кватэры. Спадабалася госцю і ўтульнае дзятлава гняздо, у якім было некалькі пакояў, і  гасціннасць птушкі.

– Малайчына, Дзяцел! – пахваліў яго Чарадзей. – Ветлівы ты гаспадар

і руплівы працаўнік! Цэлымі днямі стукаеш па ствалах дрэў – лечыш іх, будуеш-рамантуеш жыллё птушкам. Рады я за цябе!

Рушыў Чарадзей далей. Захацелася яму пабачыць, у якіх гнёздах жывуць іншыя лясныя птушкі? Пабываў ён у Салаўя. Таксама пахваліў яго за тое, што Салавей не толькі добры гаспадар, але і спявак на ўвесь лес. Падарыў Чарадзей на развітанне яму флейту, каб яшчэ мацней гучала салаўіная музыка ў лесе.

Спадабалася лясному госцю гняздо-шалашык Пеначкі, якая сустрэла яго звонкім прыветлівым спевам. Пахваліў Чарадзей і гняздо стракатай Мухалоўкі, якое было сплецена з травінак і танюсенькай бяросты.

– Зі-зі-цыт! – пачуўся прывітальны голас Каралька. – Зі-зі-цыт! Зазірні і ў маё гняздо, добры Чарадзей!

– Ой! Якое цікавае гняздо! Круглае, нібы мячык! А ўтульнае якое – высланае мяккім духмяным мохам! Цудоўнае гняздо! – добразычліва ўсміхаўся Чарадзей.

– Чы-чы-чы! Чо-чо-чо! Чаму да мяне не зазірнеш? – зачокала Чачотка, якая зведала пра Чарадзея ад Сарокі-стракатухі.

– Зазірну, зазірну і да цябе, толькі пабываю ў Дразда.

Клапатлівая пара Драздоў завіхалася каля сваіх маленькіх птушанят. Спадабалася Чарадзею іх утульнае гняздо і трапяткія адносіны да дзетак. Радаваўся Чарадзей за ўсіх птушак, у якіх пабываў. Усміхаючыся, ішоў ён далей па лесе.

Раптам з тоўстай галіны ўзнялася вялікая шэрая птушка.

– Як цябе завуць, птушка? – клікнуў Чарадзей.

– Зязюля! – адказала тая. – Ку-ку! Ку-ку!

– Хачу да цябе ў госці зазірнуць. Шмат у якіх птушак пабываў. Ці ёсць у цябе гняздо?

– А табе якая справа да майго гнязда? Ха-ха-ха! – засмяялася Зязюля.– Няма ў мяне гнязда! Навошта яно мне патрэна, калі ёсць гнёзды ў іншых птушак! Ха-ха-ха!

– Дык дзе ж ты дзяцей гадуеш?

– Іх выседжваюць і гадуюць іншыя птушкі ў сваіх гнёздах! А мне няма часу займацца такімі дробязямі.

– Няма-а-а ча-а-а-су! Няма-а-а ча-а-а-су! – паўтарыла лясное рэха.

– Няма часу… – задумаўся Чарадзей і спыніўся.

Ён пагладзіў доўгую сівую бараду.

– Няма часу?! – грозна ўсклікнуў Чарадзей. – Дык будзе час! Ты будзеш лічыць, адлічваць кожную пражытую гадзіну! Я падару табе драўляны домік, калі табе няма часу пабудаваць сабе жыллё. І ты станеш драўлянай! Стой! Спыніся!

– Яшчэ чаго! Я люблю волю, гулі! Я люблю лятаць! Я не буду сядзець у тваім драўляным доміку! – крыкнула Зязюля і зарагатала – Ха-ха-ха!

– Стань драўлянай! – злосна крыкнуў Чарадзей і выпусціў з вачэй два чароўныя прамяні.

Зязюля імгненна стала драўляный і ўпала на зямлю. Падняў яе Чарадзей і пасяліў у домік-ходзікі, каб адлічвала людзям кожную пражытую гадзіну.

З таго часу драўляная зязюлька жыве ў гадзінніку. І калі стрэлка пройдзе па кругу цыферблата, птушка выскоквае з доміка і кукуе столькі разоў, колькі паказана гадзін.



## ЧАМУ МАТЫЛЁК СТАЎ КРАПІЎНІКАМ

Сярод духмянага рознакаляровага кветніка жыў прыгожы матылёк. Ён весела кружыўся над кветкамі, махаў ім сваімі трапяткімі крыльцамі, якія былі падобныя на восеньскіякляновыя лісцікі. Кветкі вельмі любілі прыгажуна-матылька і называлі яго Кляновым Лісцікам. А ён танцаваў над імі і спяваў вясёлыя песенькі. У такія хвіліны кветкі ажывалі. Нібы чароўныя ліхтарыкі, запальваліся Астры. Крыштальнымі пераззвонамі адклікаліся Блакітныя Званочкі. Маргарыткі і Незабудкі калыхаліся ў такт мелодыі. Аксамітная Ружа – каралева кветніка, адабральна ківала сваёй мілай галоўкай і з зачараваннем слухала цудоўную музыку. Да кветніка зляталіся птушкі і кожная выводзіла сваю непаўторную руладу. Сад ператвараўся ў філармонію з разнастайнымі выканаўцамі. Кветнік жа нагадваў чароўны велізарны абрус, вышыты жывымі кветкамі.

Аднойчы матылёк ляцеў да кветак. Каля агароджы саду ён заўважыў зялёную расліну з шырокім буйным лісцем. Яна цвіла сціплымі дробнымі зеленаватымі кветачкамі, якія, нібы крупінкі, звісалі з тонкіх сцяблінак. Расліна была непрыкметная сваёй прыгажосцю.

“Цікава, – падумаў Кляновы Лісцік, – што гэта за кветка такая? Раней я яе не сустракаў”.

– Як цябе завуць? – спытаў матылёк.

– Я – Крапіва! – адказала расліна і кінула калючы позірк на матылька. – Ты мяне не ведаеш?! Я тут самая галоўная і прыгожая! Мяне ўсе ведаюць і баяцца!

– Ты?! – засмяяўся матылёк. – Калі ты самая прыгожая, дык чаму расцеш каля плоту ў зеллі, а не ў кветніку? На клумбе каля хаты жывуць самыя прыгожыя кветкі, а твае нават не падобныя на іх.

– Што?! – абурылася Крапіва. – Ты адважыўся мне такое сказаць?! Пачакай жа, хутка я прарасту на кветніку, давядзецца тваім кветкам ад мяне! І ты ўпэўнішся, што мяне можна параўнаць толькі з пякучай маланкай!

– З маланкай?! – здзівіўся Кляновы Лісцік і падляцеў бліжэй да расліны.

– Так! З маланкай! – паўтарыла Крапіва, і моцна схапіла матылька.

– Ай! Ай! – закрычаў матылёк ад нясцерпнага болю і ўпаў на траву. Яго прыгожыя крыльцы пачарнелі.

Матылёк ляжаў у траве і стагнаў, а Крапіва злым, халодным позіркам сачыла за сваёй ахвярай.

У гэты момант на дапамогу матыльку прыляцеў Вецер, які ўсё бачыў і чуў. Ён падзьмухаў на абпаленыя крыльцы, але матылёк яшчэ больш застагнаў. Раптам на крылах пачалі прабівацца яркія аранжавыя плямкі. Вецер зразумеў, што трэба клікаць на дапамогу Дождж.

– Выручай, сябрук! – крыкнуў Вецер. – Там, у садзе, апалены Крапівою матылёк! Патрэбна твая халодная вада, каб аблегчыць яму боль.

Дождж пырснуў на матылька дробнымі кропелькамі, і на крылах сярод чорнай аблямоўкі з’явіліся сінія крапінкі.

Матылёк адчуў палёгку. Ён паспрабаваў узляцець, але не змог. Тады Вецер далікатна падзьмухаў на яго, і матылёк закружыўся ў палёце.

– Ветрык і Дожджык, дзякуй, што выратавалі! – крыкнуў ён і накіраваўся да кветніка.

– Бывай, дружа! – развіталіся з ім сябры. – Калі што – кліч на дапамогу!

Матылёк ляцеў да кветак. Раптам ён заўважыў сваё алюстраванне ў невялікай лужыне і страпянуўся.

“ Як жа я, такі апалены, непрыгожы, з’яўлюся перад кветкамі?! – у роспачы падумаў матылёк. – Яны са мной цяпер нават вітацца не захочуць, не тое, што сябраваць!”

Кветкі здалёк заўважылі незнаёмца, загаманілі, зашапацелі.

– Які непрыгожы чорны матылёк! – усклікнула каралева Ружа. – Адкуль ты такі з’явіўся?

– Да нас прылятаў матылёк Кляновы Лісцік! Прыгажун! – заміргала жоўтымі вочкамі Астра.

– А мне, напрыклад, вельмі падабаецца гэты матылёк. Нічым ён не горшы за Кляновы Лісцік, – прыкмеціў мудры фіялетавы Гладыёлус.

– Так, так, і мне ён вельмі падабаецца! – пагадзілася высокая Мальва.

– У яго прыгожыя загадкавыя крыльцы – скрозь чорныя плямкі

прабіваецца аранжавы колер. Такі ж, як і ў нашага Кляновага Лісціка. Чымсьці ён яго і нагадвае. Сядай на маю самую верхнюю кветку, – запрасіла яна і прыветліва замахала пялёсткамі.

Матылёк дакрануўся сваімі аксамітнымі крыльцамі да Мальвы.

– Не звяртай увагі, – шапнула яна, – ты пяшчотны прыгажун.

Матылёк моўчкі ўсміхнуўся і заварушыў тонкімі доўгімі вусікамі.

Мінуў час. Матылька палюбілі ўсе кветкі за турботу, цеплыню і загадкавую прывабнасць. А ён, як і раней, весела пырхаў над імі.



Тым часам Крапіва не драмала, а ўсё больш і больш наступала на кветнік. І вось аднойчы прарасла сярод садовых прыгажунь. Яна балюча пякла іх пяшчотныя лісцікі і пялёсткі.

– Ай! Ай! – ускрыквалі кветкі.

– Не дам я вам жыць спакойна! – злавалася варожая Крапіва.

– Ах ты, нягодніца! – падляцеў да яе матылёк. – Не чапай маіх кветак!

– А-а-а, гэта ты, апалены прыгажун?! – злосна засмяялася пякучка. – Мала я табе крылы пакалечыла? Яшчэ жадаеш?

Кветкі пачулі словы Крапівы і здзіўлена пераглянуліся.

– Дык гэта ты змарнавала крылы нашаму матыльку – Кляноваму Лісціку?! – не на жарт абурылася каралева Ружа. – Ах ты, злое нягоднае пустазелле! І яна сваімі вострымі ўпілася ў Крапіву.

– Ай! – завішчала пякучка, хаваючыся ў кветкі.

Тым часам матылёк ужо ляцеў клікаць на дапамогу Вецер.

– Вецер! Вецер! Ты такі магутны, ты ўсё можаш! – крыкнуў матылёк. – Дапамажы выратаваць маіх сяброўак ад Крапівы! Няма рады – распаўзлася па ўсім садзе!

– Добра! – адказаў Вецер і віхурай памчаўся да кветніка. Ён адным

махам павырываў усю Крапіву. А потым лёгкім павевам падбадзёрыў пакамечаныя кветкі. Матылёк радасна кружыўся над сяброўкамі.

– Дык гэта Крапіва цябе так пакалечыла, Кляновы Лісцік? – спачувала каралева Ружа.

– Чаму пакалечыла? – зноў умяшаўся Гладыёлус. – Наадварот, падарыла яму непараўнальную, загадкавую прыгажосць! Зірні, як ён цудоўна выглядае! Праўда, этая чорная аблямоўка з сінімі кропелькамі на крыльцах, крыху сумная, але яна такая яркая на вясёлым аранжавым фоне і так пасуе нашаму прыгажуну. Наш матылёк – адважны пераможца над злючкай-Крапівою. Давайце ў напамін пра мужнасць назавём яго Крапіўнікам. Каб не наш шчыры сябра, загінулі б мы тут: высушыла б і нас і нашы карэньчыкі, спаліла б лісцікі і кветкі дзікая пякучая расліна.

І ўсе кветкі радасна зашамацелі-заапладзіравалі рознакаляровымі пялёсткамі.

## ЧАМУ СНЯГІР ЧЫРВОНАГРУДЫ

Калі пачынаюцца першыя замаразкі і зямля пакрываецца лёгкім сняжком, з Поўначы да нас прылятаюць зімовыя госці – чырвонагрудыя Снегіры.

Некалі яны былі звычайнымі непрыкметнымі птушкамі. Спінка ў снегіроў была блакітна-шэрая, кончыкі крылаў і хвост – чорныя, на галаве – чорная шапачка. Грудка ж была белая, як снег. Такая афарбоўка дапамагала птушкам хавацца ад ворагаў. Сядзе снягір на сумёт, натапырыць сваё пер’е, галоўку пад крыло схавае – і не адрозніць яго ад камячка снегу.

Карміліся зімовыя госці насеннем ясеня, вольхі, бярозы, ласаваліся ягадамі бузіны і чаромхі. Сваімі шырокімі дзюбкамі яны выкалупвалі з ягадаў зярняткі.

Адзін раз ляцела вясёлая чародка Снегіроў. Здалёк птушкі заўважылі незвычайнае дрэва. Яно палымнела чырвонымі плямкамі.

– Якое дзівоснае дрэва! Паляцелі да яго! – прапанаваў галоўны Снягір.

– Фі-фі-фі! Ф’ю! Ф’ю! Паляцелі! – пагадзіліся птушкі і дружна накіраваліся да дрэва, на якім з-пад шапак снегу выглядалі гронкі чырвоных ягад.

– Як цябе завуць, дрэўца? – спыталі Снегіры.

– Рабіна.

– Якія прыгожыя твае ягады!

– Яны не толькі прыгожыя, але і смачныя! – адказала Рабіна. – Пасля замаразкаў робяцца салодкімі.

– Можна нам спрабаваць зярнятак з ягадаў? – на перабой прасілі птушкі.

– Калі ласка, частуйцеся! – адказала дрэва.

– Фі-фі-фі! Ф’ю-ф’ю! Дзякуй! Дзякуй! – зашчабяталі вёрткія Снегіры. Яны скакалі з галінкі на галінку і выдзёўбвалі з ягадаў зярняты, толькі рэшткі падалі на зямлю.

– Якія салодкія зярняткі! Смаката-а-а! Смаката-а-а! – разносіла зімовае рэха радасныя птушыныя галасы.



Снегірам вельмі спадабаўся пачастунак Рабіны. Яны так захапіліся ягадамі, што не заўважылі, як іх белыя грудкі пафарбаваліся ў яркі чырвоны колер. І цяпер іх немагчыма было адрозніць ад чырвоных гронак рабіны.

– Глядзіце, якія мы ўсе чырвонагрудыя! – заўважыў адзін са Снегіроў.

Усе птушкі імгненна перасталі есці і здзіўлена аглядалі адна адну.

– А мне падабаецца наша новае ўбранне, – сказаў галоўны Снягір.

– Ф'ю! І мне!

– І мне! Ф'ю! Ф'ю!

– І мне!.. – чулася вясёлая птушыная гамонка. – Цяпер мы не белагрудыя, а чырвонагрудыя Снегіры!

– Так, і мне вельмі падабаецца ваша чырвонае ўбранне! – усміхнулася Рабіна.

– Гэта ад тваіх сакавітых ягадаў мы зрабіліся такімі прыгожымі! – сказаў галоўны Снягір.

– Так! Так! Ад ягадаў! – радасна падхапілі яго сябры.

І цяпер Снегіры, нібы чырвоныя гронкі рабіны, упрыгожваюць заснежаныя галінкі дрэў і песцяць людское вока.

# ТВОРЫ З КНІГІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ “НАДЗЕЙКА-ЧАРАДЗЕЙКА”

## ЯК ВЕСЯЛІНКА ПЕРАХІТРЫЛА ХІТРЫНКУ

казка

Жылі-былі дзве ваверкі-сяброўкі Хітрынка і Весялінка. Хітрынка была кемлівай, хітрай. Неяк дзяцел Дзяўбун зрабіў на старым дубе дупло і нікога не пускаў туды жыць. А Хітрынка так да яго паддабрылася, так яго перахітрыла, што дзяцел памякчэў, падабрэў і падарыў ёй гэтае жытло. І да цяперашняга часу яна там жыве. Вавёрка заўсёды знаходзіла выйсце з любога жыццёвага становішча. Шмат чаго Хітрынка выдумвала, фантазіравала, але рабіла гэта дзеля добрых спраў. Разважлівая і мудрая вавёрка магла вырашыць любую жыццёвую праблему. Таму да яе звярталіся за парадай амаль усе лясныя жыхары. Хітрынка вельмі ганарылася.

Весялінка жыла непадалёку ад Хітрынкі, таксама ў дупле на высокай старой сасне. Была яна вясёлай і жыццярадаснай. Заўсёды падбадзёрвала Хітрынку, калі ў тае быў кепскі настрой. Вавёрка сама складала песенькі, якія адразу, скачучы з дрэва на дрэва, спявала тоненькім піскявым галаском. Любілі Весялінку лясныя жыхары за яе залівісты, падобны на пералівы званочка, смех. Яна ўсім уздымала настрой. Калі вавёрка скакала па дрэвах і спявала новую песеньку, усе, хто яе чуў, падымалі галовы ўверх, усміхаліся ёй і махалі лапкамі. Нават стары вожык Крактун, які толькі кракатаў ад старасці і якога нічога не турбавала, акрамя таго, каб здабыць сабе ежу, захапляўся незвычайнай вавёркай. Ён пазіраў праз ларнет і шукаў на дрэвах вясёлую вавёрку.

– Ну, дзе, дзе, гэтая прыгажуня Весялінка? – усміхаўся вожык.

Але бачыў толькі агністы пушысты хвосцік, які мільгаў паміж галінак дрэў.

– Ох, няўседа! – махаў сукаватым кіёчкам Крактун.

Хітрынка і Весялінка былі руплівымі і запаслівымі гаспадынямі. Цэлае лета і ўсю восень яны нарыхтоўвалі сабе запасы на зіму. Сяброўкі сушылі на сучках шышкі, грыбы, розныя карэньчыкі. Скачучы па арэшыне, Хітрынка лапкамі збівала самыя спелыя і вялікія арэхі, і яны падалі на зямлю.

– Ай, ай! – пішчала Весялінка пад арэшынай, прыцiснуўшы вушкі-мяцёлачкі да галавы. – Гэта ж арэхавы град!

І хуценька збірала арэхі ў кошычак. Сяброўкі назапасілі шмат шышак, арэхаў, грыбоў і карэньчыкаў. А калі ўвосень даспелі апошнія дробненькія яблыкі на старой яблыні-дзічцы, якая расла на лясной палянцы, яны і іх насушылі. Усе запасы вавёркі злажылі ў дупле Весялінкі.

І вось аднойчы сяброўкі-вавёркі паспрачаліся паміж сабой.

– Не верыш, Хітрынка, ты не самая хітрая вавёрка ў лесе. Я магу цябе перахітрыць! – з выклікам прамовіла Весялінка.

– Не, у нашым лесе хітрэйшай вавёркі за мяне няма! Я ўпэўнена! Я самая кемлівая і хітрая! – ганарова задрала свой маленькі носік-кнопачку Хітрынка.

– Убачыш, і вельмі хутка, што я цябе перахітру! Ты і не заўважыш, як я гэта зраблю! – таксама задзёршы носік і хітра прыжмурыўшы вочкі, заверыла Весялінка.

– Згодна, перахітры, калі зможаш! – засмяялася сяброўка.

Восень з халоднымі маркотнымі дажджамі, поўным ходам крочыла па лесе, зрываючы з дрэў апошняе лісце. Вавёркі сядзелі ў цёплым дупле Весялінкі.

– Давай падзелім усе нашы назбіраныя запасы. Сваю палавіну я занясу сабе ў дупло, бо зімою засыпле снегам лес, і я не змагу да цябе дабрацца, – прапанавала Хітрынка.

– Добра, – адразу пагадзілася сяброўка, – прыходзь заўтра з кашом, будзем дзяліць.



На наступны дзень вавёркі злажылі ўсе свае запасы пасярэдзіне дупла. Іх атрымалася так шмат, што Весялінка здзівілася:

– Нездарма мы так працавалі! Гэтых запасаў не толькі нам хопіць, але яшчэ можам з кім-небудзь падзяліцца.

– Не, я не буду ні з кім дзяліцца, – адмовіла Хітрынка, – няхай лепш застануцца.

– Ну, тады падзелім паміж намі, – пагадзілася Весялінка. – Гэта – табе, гэта – мне, – прыгаворвала яна і клала па чарзе запасы то ў адзін, то ў другі кошычак. А калі Хітрынка няўважліва сачыла, як дзеліць сяброўка, то частка запасаў трапляла ў трэці прыхаваны кошычак. Весялінка рабіла гэта так спрытна, што Хітрынка нічога не заўважала.

– Цяпер я ведаю, што зіма будзе не галоднай! Сапраўды, гэтых харчоў хопіць не толькі мне, але і маім гасцям! – узрадавалася сяброўка, калі ўсё было падзелена.

– Вось і цудоўна! – падтрымала яе Весялінка і хітра ўсміхнулася.

Вечарам, калі Хітрынка панесла сваю частку запасаў дадому, Весялінка дастала прыхаваны кошычак і паклала туды яшчэ таго-сяго. Потым, скачучы з сучка на сучок, спусцілася з дрэва. Азіраючыся, яна панесла пачастункі старому вожыку Крактуну. Вавёрка ведала, як цяжка яму, слепаватаму, адшукаць сабе корм. Таму вырашыла дапамагчы, жартаўліва перахітрыўшы Хітрынку.

– Дзякуй, Весялінка! – радаваўся вожык і разглядваў пачастункі. – Мне вельмі прыемна, што ты пра мяне памятаеш! Атрымліваецца, што ты не толькі вясёлая і працавітая, але яшчэ клапатлівая і спагадлівая.

– Гэта пачастункі не толькі ад мяне, але і ад маёй сяброўкі Хітрынкі, – усміхнулася вавёрка. – Заўтра знойдзеш яе, падзякуеш і ёй за клопаты.

– Абавязкава падзякую! – паабяцаў вожык.

– А цяпер мне трэба дадому. Добрай ночы, Крактун! – пажадала вавёрка і паскакала ў начную цемру.

– Дабранач! – махаў лапкай вожык і пазіраў ёй услед добрым пяшчотным позіркам. Але не паспеў ён развітацца з Весялінкай, як у дзверы зноў пастукалі. Вожык адчыніў і здзівіўся: на парозе з кошычкам лясных пачастункаў стаяла вавёрачка Хітрынка.

## САРОКА-ВЫРАТАВАЛЬНІЦА

Казка

*Па законе прыроды, калі ў буслінай сям'і нараджаецца нядужае хворае дзіця, бацькі самі выкідаюць яго з гнязда, і такое птушаня асуджана на пагібель*

Маладая пара буслоў збудавала сабе буслянку на саламянай страсе хаты. Праз некаторы час буслы чакалі ў сям'і прыбаўленне – маленькіх буслянят-нашчадкаў. Сонечным летнім днём вылупілася першае птушаня. Бусел з Буслíхай узрадаваліся, дапамаглі яму вызваліцца ад шкарлупіны. Нованароджанага Бусліка трэба было пакарміць, і тата адразу паляцеў шукаць яму ежу. Пакуль ён паляваў, у гняздзе з'явілася яшчэ адно дзіця. Засталося толькі адно яйко з якога вось-вось павінна было вылупіцца трэцяе птушаня. Але яно марудзіла, доўга не з'яўлялася на свет.

І вось аднойчы Бусліха пачула, як нерашуча праклёўвае шкарлупіну яе трэцяе дзіця. Яна хуценька дапамагла сыночку вылезці са шкарлупіны і радасна абняла яго. Бусляня расло марудна, было слабое, кволае, нічога не ела, нават галаву не падымала.

Аднойчы кажа Бусліха-маці Буслу:

– Штосьці наша трэцяе дзіця зусім слабое, нерухомае. Мабыць, хворае?

– Трэба пазбавіцца ад яго – выкінь з гнязда, бо і гэтыя дзеці могуць захварэць. І тады ніводнага дзіцяці не будзеш мець! – сказаў Бусел.

– Ах, як мне яго шкада! – схапілася крыламі за галаву Бусліха і заплакала.

– Шкада, не шкада! Зрабі так, як я сказаў! – строга загадаў Бусел.

Пагаравала, паплакала Бусліха, дый выкінула хворае Бусляня з гнязда.

– М-я-я-яў! – замяўкаў Кот, які ўбачыў птушаня каля куста парэчкі. – Зараз я ім падсілкуюся!



У гэты час на плоце сядзела Сарока, якая ўвесь час сачыла за Катом. Бо гэты небарака не раз спрабаваў залезці да яе ў гняздо. Але пільная птушка ганяла Ката, бязлітасна клявала яго ў галаву. Баяўся ён яе.

Кот, аблізваючыся, набліжаўся да Бусліка, які бездапаможна ляжаў на траве.

– Ча-ча-ча! Чакр! Чыкр! Чыррл! Чара! – застракатала Сарока. – Чыр! Чыр!

Не чапай Бусліка! Пайшоў пр-р-рэч!

– Мя-у-у-у! – спалохаўся Кот знаёмай варожай Сарокі і кінуўся наўцёкі.

Сарока зляцела з плоту, падскочыла да паміраючага Бусліка, абгледзела яго з усіх бакоў.

– Шкада мне цябе, беднае дзіця! Шкада, дый падобны ты на маіх дзетак, – спачувала птушка, – паспрабую я цябе вылечыць і выгадаваць. Мае дзеці ўжо вялікія, умеюць лятаць, ежу сабе могуць адшукаць. А я цябе буду ратаваць.

Буслік моўчкі прыадкрыў дзюбку.

– Ты хочаш піць, – здагадалася кемлівая Сарока, – зараз я табе прынясу вады.

Яна азірнулася вакол і паляцела да чалавечага жылля. Набрала ў дзюбу вады і прынесла Бусліку. Птушаня праглынула ваду і расплюшчыла вочкі.

– Ма-ма… – слабенькім галаском прашаптаў Буслік.

– Так, я буду тваёй мамай! – рашуча згадзілася Сарока, – я цябе вылечу, выкармлю, навучу лятаць! Ты вырасцеш дужым, здаровым і прыгожым!

Слабенькі Буслік усміхнуўся і зноў заплюшчыў вочкі.

Сарока прынесла Бусліка ў сваё гняздо. Яна растлумачыла дзецям, што Буслік хворы, і яму патрэбна дапамога.

– Ча! Ча! Чакр! Чырк! Чыррл! Чыр! – застракаталі, заскакалі вакол Бусліка сарочыныя дзеці. – Мы будзем табе дапамагаць!

– Чакр! Чыр! Мы будзем яго даглядаць!

– Ча! Чыррл! Мы будзем яго карміць!

– Чыр! Чырк! Навучым яго лятаць!

– Малайцы дзеткі! – пахваліла іх Сарока, – якія вы чуллівыя і разумныя ў мяне!

Дружная сарочынасям’я выходжвала Бусляня. Доўга не магло птушаня акрыяць. Але клапатлівая Сарока і яе дзеці змаглі перамагчы хваробу, і Буслік пачаў папраўляцца. З кожным днём ён станавіўся дужэйшым, спрабаваў трымацца на крылах і хутка навучыўся лятаць.

– Ча! Ча! Чакр! Чыррл! Чыр! – радасна застракатала Сарока на ўсю акругу. – Наш Буслік навучыўся лятаць. Чырк! Чырк! Я казала, што вылечу яго! Чакр! Чыр! Гэта я не дала загінуць выкінутаму Бусліку! Прыгожы вырас! Здаровы! Чыр! Чыр!

Пачула гэта Бусліха і пытаецца ў Бусла:

– Пра якога гэта Бусліка Сарока навіну на хвасце прынесла?

– Не ведаю… – панура прамармытаў Бусел.

– Выкінуты Буслік?! Можа гэта наша дзіця яна ўратавала? – не магла супакоіцца Бусліха.

Не ўтрывала яна, паляцела да Сарокі, каб даведацца праўду пра Бусляня.

– Сарока, Сарока, скажы, пра якое Бусляня ты тут стракатала?

– Ды пра таго, што знайшла ледзьве жывога ў пачатку лета каля куста парэчкі. Вылечыла я яго! На ногі паставіла! Чакр! Чакр! На крылы ўзняла! Не дала загінуць!

– Гэта мой сынок! – заплакала Бусліха.

– Не, не твой! – пачулі яны моцны голас з вышыні. – Не тая маці, што нарадзіла і, спалохаўшыся маёй хваробы, выкінула, а тая, што падняла, не дала памерці, вылечыла і выгадавала, – горда адказаў Бусел.

Ён узняў на сваіх здаровых прыгожых крылах маму-Сароку і закружыўся ў высокім небе.

## ЯК ЗВОНЧЫК ШУКАЎ УТУЛЬНУЮ ХАТКУ

казка

На зялёным лузе сярод духмяных кветак у гняздзе жыў маленькі жаўрук Звончык. Акрамя яго там яшчэ гадаваліся два брацікі Шустрык і Спявак. Мама назвала жаўрука Звончыкам, таму што, як толькі ён навучыўся трымацца на крылах, рана-раненька ўзлятаў у паднябессе і звонка спяваў песні, якія ліліся на ўсю акругу. Звончык у гняздзе сядзець не любіў. Там яму было цесна. А з вышыні можна было паназіраць, убачыць шмат чаго новага і цікавага. Жаўрук бачыў хаткі-гнёзды розных птушак. І яму здавалася, што яны прыгожыя, утульныя . Не такія, як ягонае гняздо. Звончыку хацелася там пабываць, пажыць у чужых гнёздах. Асабліва на буслянцы. Гэта ж сапраўдны птушыны замак – прасторны, вялікі, на высокай вежы!

Аднойчы жаўрук ляцеў над балоцістым лугам. У траве ён заўважыў гняздо Куліка. Там нікога не было.

“Во, – падумаў Звончык, – самы час пабыць у хатцы Куліка”.

Ён апусціўся на гняздо, а потым разлёгся на пушыстых пярыначках, расставіў крылы, закінуў лапку на лапку...

– Прыгажосць! Мякка, утульна, але неяк няёмка. Гэта ж чужая хатка, а я няпрошаны госць. – разважаў Звончык. – Не, трывожна, не сціпла сядзець без дазволу ў чужым гняздзе. Ён узняўся і паляцеў далей.

Пакружыў жаўрук над палеткамі ды вырашыў наведацца ў лес, хоць туды ён ніколі не лятаў. Ён жа палявы жаўрук. І павінен сваімі песнямі праслаўляць лугі, палі і сенажаці. Але Звончыка так вабіў лес, што ён не ўтрымаўся. Там, напэўна, птушкі жывуць у незвычайных хатках-гнёздах? Заляцеў жаўрук у лес, сеў на елку, азірнуўся навокал і ўбачыў гняздо, звітае з сухіх галінак і карэньчыкаў, высланае пажаўцелым мохам. А там незнаёмае птушаня старалася выкаціць з гнязда чатыры зеленавата-блакітныя яечкі. То адно ўздыме на спіне – падкоціць, то другое, то трэцяе… Звончык здзіўлена назіраў за ім, а потым здагадаўся, што так робяць падкінутыя зязюльчыныя дзеці.

“Чыё ж гэта гняздо? – задумаўся жаўрук. – Куды ж паляцела птушка? Можа ежу шукаць? А падкідыш задумаў знішчыць яе будучых дзетак.”

– Скажыце, калі ласка, чыя гэта хатка? – спытаў Звончык у птушкі, якая пралятала побач.

– Лясной завірушкі. Яна будуе гнёзды на елках або кусціках ядлоўцу, – крыкнула птушка і падалася ў глыб лесу.

– Дзякуй! – адказаў жаўрук.
Ён не мог больш назіраць, як Зязюльчаня выпіхвае яечкі і моцна крыкнуў:
– Што ты робіш?! Навошта?! Яечкі ж упадуць і паб'юцца!
– Дык я і стараюся іх знішчыць, – адказала птушаня, – не крычы, а лепш дапамажы мне!
– Ні-за-што! Так нельга рабіць! – яшчэ мацней крыкнуў Звончык і пачаў клікаць на дапамогу птушак. А потым скокнуў у гняздо і сваімі крыламі пачаў затуляць яечкі, адпіхваючы Зязюльчаня.

У гэты момант прыляцела незнаёмая птушка. Яна ўхапіла шкоднае птушаня і кудысьці панесла.
– Так табе і трэба! – крыкнуў жаўрук, а сам прысеў і хацеў адпачыць. Але яму было тут няўтульна, цесна. Гэтыя яечкі, якія ён выратаваў, займалі амаль усё гняздо. Пакруціўся, паскакаў каля іх жаўрук, дый паляцеў далей.

У зарасніку ён адшукаў гняздо Дразда і таксама пабываў там. Каля разложыстай чаромхі ў густой траве жыў Салавей, які запрасіў Звончыка ў госці. Пабыў жаўрук і ў хатцы-дупле Дзятла. Не спадабалася яму там – цёмна, цесна сярод дзятлавых дзетак. Завітаў жаўрук-падарожнік і да Сініцы, якая жыла ў шчыліне расшчэпленага маланкай дрэва.
"Няўтульна, як і ўсюды – усё чужое", – падумаў Звончык і вырашыў вяртацца дамоў.

Ён паляцеў праз бярозавы гай і раптам убачыў на высокім дрэве нейкі кошычак, сплецены з тонкіх галінак. Жаўрук не ўтрымаўся, каб не зазірнуць туды. У кошычку ціўкала пяць птушанят, а каля іх завіхалася клапатлівая прыгажуня Івалга. Звончык вельмі здзівіўся. Ён не ведаў, што кошычак – гэта яе гняздо. Хітры жаўрук сеў на суседні сучок і чакаў, калі Івалга кудынебудзь паляціць. І калі птушка вылецела з гнязда, ён ускочыў туды. Але у гняздзе было так цесна! Дый яно злёгку калыхалася. Звончыку зрабілася страшна. Ён не прывык да такіх арэляў. Спалоханы жаўрук вылецеў з гнязда і паляцеў далей.

Па дарозе ён сустрэў Аўсянку, якая запрасіла яго ў сваю хатку-гняздо. Яно знаходзілася на схіле канавы. Звончыка здзівіла тое, што яе гняздо падобнае на жаўруковыя гнёзды – такая ж самая звітая з карэньчыкаў і сцяблінак чашачка.

Пабыў цікаўны жаўрук і ў Амялушкі. Але і ў гэтых хатках нічога незвычайнага не было. Усе гнёзды падобныя. Засталося падарожніку-Звончыку здзейсніць яшчэ адну самую запаветную мару – пабываць на буслянцы, якая вабіла яго больш за ўсё. Прыляцеў ён да буслянкі і назірае: корміць Бусліха-маці сваіх дзяцей і прыгаворвае:
– Ешце, мае маленькія. Падрастайце, набірайцеся сілы, узмацняйце крылы. Хутка будзем вучыцца лятаць.

"Нічога сабе, – маленькія, – падумаў Звончык, – а ядуць колькі! Мне гэтай ежы, што яны за адзін раз праглынаюць, на тыдзень хапіла б!"
– Тук-тук-тук, – пастукаў жаўрук дзюбкай, – калі ласка, дазвольце мне прысесці на вашай буслянцы.
– Калі ласка, – прыветліва запрасіла Бусліха.

Звончык скокнуў на гняздо і яго лапка правалілася ў шчыліну. Іх было шмат сярод пераплеценага зрэдку галля. І лапкі жаўрука раз за разам траплялі ў гэтыя шчыліны.

"Ай, як небяспечна! – падумаў ён. – Можна лапы паламаць!"

На пуховай мяккай пасцельцы адпачывала трое буслянят, схаваўшы дзюбы пад свае крылы. Яны не прапанавалі госцю прысесці каля іх, і ён ускочыў на сучок, які тырчаў з галля. Паглядзеў жаўрук, што і на буслянцы нічога незвычайнага няма, развітаўся з бусламі і накіраваўся дадому – у роднае гняздо.

"Ні ў адной хатцы нічога асаблівага і шыкоўнага няма, – думаў ён па дарозе".

Стомлены вандроўкай, Звончык прыляцеў на сваё гняздо. Ён радасна скочыў на мяккую пасцельку, па якой моцна засумаваў, абняў пушыстых брацікаў і прымасціўся сярод іх. Жаўрук доўга пазіраў у блакітнае неба…

"Нідзе так утульна, вольна і цёпла не бывае, як у сваёй хатцы, у сваім родным куточку, сярод родных брацікаў", – падумаў стомлены Звончык, сагрэўся і салодка заснуў.



## НАДЗЕЙКА-ЧАРАДЗЕЙКА
казка

Жыла на свеце прыгожая, аптымістычная, ініцыятыўная і разважлівая Надзейка-чарадзейка. Дзецям, якія марылі пра што-небудзь добрае, яна дапамагала. І адбываліся цуды.

Хлопчык Кастусь вучыўся ў чацвёртым класе. Быў ён гультаяваты. Вучыцца не вельмі хацеў. Зробіць так-сяк урокі, і хутчэй у камп'ютарныя гульні гуляць. Нават на вуліцу не выходзіў, каб пабегаць, мячык паганяць з сябрамі. Увесь вольны час хлопчык праводзіў каля камп'ютара. Ён гатоў быў і ў школу не хадзіць, так паглыналі яго гэтыя гульні. Трэба ж пазастрэльваць з аўтамата ўсіх ворагаў у гульні "Контр Страйк". Або напружана згорбіўшыся, Кастусь гнаў на ўсёй хуткасці машыну па прыгожых вуліцах незнаёмага горада. Ён збіваў слупы, машыны, людзей, уцякаючы ад паліцыі.

– І чаму толькі вучаць гэтыя гульні?! – не раз абуралася мама. – Забіваць людзей, красці машыны, уцякаць ад паліцыі. Сядзіш цэлымі днямі згорбіўшыся! Лепш на стадыёне пабегаў бы, спортам заняўся. Так і падзваночнік можна скрывіць.

І яна забараняла сыну доўга гуляць. Але хлопец не звяртаў увагі. Калі мама была на працы ён, крадучыся, ганяў з аўтаматам ворага.

Прайшоў час, і Кастусь заўважыў, што яму стала балець спіна і шыя. Бывала так, што не мог галавы павярнуць. Ён паскардзіўся маме.

– Ну вось, напэўна, твае гульні бокам вылазяць?! Я ж папярэджвала, што трэба менш сядзець ля камп'ютара! А ты мяне не слухаеш!

Мама завяла Кастусіка да доктара. Доктар агледзеў хлопца і паставіў дыягназ:

– Скаліёз. Дыскі падзваночніка зрушаныя. Трэба сур'ёзна лячыцца.

Ён прызначыў Кастусю лячэнне – масаж, фізічныя практыкаванні, а таксама таблеткі для ўмацавання падзваночніка. Хлопцу прыйшлося надоўга легчы ў ложак. Боль у спіне не даваў нават прысесці, а тым больш, устаць і хадзіць.

Аднойчы застаўся Кастусь адзін у кватэры і вельмі засумаваў. Хацелася пагуляць з сябрамі на вуліцы. Сумныя думкі адна за другой лезлі ў галаву, і па шчаках на падушку каціліся слёзы.

– Што ж я буду рабіць, калі не змагу зусім хадзіць, – плакаў хлопчык, – і чаму я не слухаў маму?

І тут ён убачыў маленькую мутнаватую постаць. Яна скакала па коўдры і ўсміхалася.

– Ты хто? – спалохаўся Кастусь.

– Я – Надзейка-чарадзейка. Умею ствараць цуды. Ведаю, пра што ты думаеш і чаго плачаш. Не хвалюйся, я табе дапамагу, таму што ўсім дапамагаю. Толькі не раскісай, а думай пра добрае і светлае. Ты павінен марыць і спадзявацца, што выздаравееш.

– Не, ты мне не дапаможаш. У мяне запушчаны скаліёз.

– Якраз я з'явілася для таго, каб цябе падтрымаць і буду жыць побач з табою, пакуль ты не вылечышся. Перш за ўсё, вытры слёзы і ўсміхніся. Думай, што ты не хворы, а здаровы.

У гэты момант у пакой зайшла мама, якая незаўважна вярнулася з працы.

– Як ты, сынок? – папраўляючы коўдру, спытала яна.

– Скажы, што табе ўжо лепш, не засмучай маму, – шапнула на вушка Кастусю Надзейка-чарадзейка.

– Мне ўжо лепш. Не так баліць спіна, – усміхнуўся сын.

– Я рада за цябе, Кастусёк. Зараз будзеш піць лекі.Ты хутка выздаравееш, трэба толькі спадзявацца.
– Вось, малайчына мама! – радасна заскакала па падушцы нябачная Надзейка-чарадзейка.

Мама лячыла сына, а Надзейка-чарадзейка заўсёды была побач. Яна падбадзёрвала Кастуся, дапамагала перасіліць боль, калі ён рабіў фізічныя практыкаванні. Яны нават песеньку развучылі разам. І хлопчык пачаў папраўляцца. Падзваночнік перастаў дакучаць. Кастусь ужо перамяшчаўся па пакоі, выконваў маміны даручэнні. І заўсёды побач з ім была яго надзейная спадарожніца, якая разам з мамай вылечыла хлопчыка.



Аднойчы Надзейка-чарадзейка сказала Кастусю:
– Сёння я развітваюся з табою, таму што ты ўжо здаровы. Я павінна наведаць іншых хлопчыкаў і дзяўчынак, каб дапамагчы ім здзейсніць мары і жаданні. Але памятай – я развітваюся з табой не назаўсёды. Як толькі ты паклічаш, Надзейка-чарадзейка пачуе цябе і заўсёды дапаможа.

# ТВОРЫ З КНІГІ “ВАВЁРЧЫН БАРАВІК”



**СНІКЕРС**

Ганка і Людмілка сябруюць з першага класа. Як селі першага верасня за адну парту, так і не разлучаюцца. Настаўніца ніколі іх не рассаджвае, таму што дзяўчынкі адна без другой не ўяўляюць свайго існавання. Ды навошта іх разлучаць? Паводзіны ў сяброўак прыкладныя, і вучацца яны добра. Ніхто на іх ніколі не паскардзіўся.

Дзеляцца Людмілка з Ганкай паміж сабой усім, што толькі маюць. Стаяць адна за другую гарою. За чатыры гады іх сяброўства па-дзіцячаму прайшло выпрабаванні, загартавалася і ўзмацнілася.

Аднойчы тата купіў Ганцы два “Снікерсы”. Дзяўчынка адразу адзначыла: “Адзін – мне, а другі – Людмілцы. Як жа я з’ем два, а ёй ніводнага? Заўтра на перапынку пачастуемся”. Яна пакруціла батончыкі ў руках і пашкадавала, што так яшчэ доўга чакаць да таго, каб іх з’есці. А потым паклала “Снікерсы” ў заплечнік. Ганка вучыла ўрокі, а думкі перабівалі батончыкі. І ад гэтых думак збіралася сліна ў роце – так ужо хацелася чаго-небудзь смачненькага, салодзенькага, шакаладненькага.
“Хутчэй трэба легчы спаць, – думала яна, – а то не вытрымаю і з’ем свой “Снікерс”. А можа і праўда, з’есці адзін, а Люда адкуль будзе ведаць, што ў мяне было два? Яна са мной яшчэ і сваім падзеліцца. О! Так і зраблю!”

Дзяўчынка дастала батончык, зняла абгортку і з асалодай адкусіла кусочак. Прыемна захрумсцеў смажаны арахіс, салодка раставалі шакалад і карамель у роце.

– Якая смаката! Якая асалода! – шаптала дзяўчынка і адкусвала раз за разам батончык.

На перапынку наступнага дня Ганка дастала снікерс і працягнула Людмілцы.

– На, гэта табе, мая мілая сяброўка! – шчыра сказала яна.

– А ў цябе ёсць? – здзіўлена зірнула на яе Люда.

– А ў мяне няма.

– А… ты свой з’ела, так? – здагадалася сяброўка і адкусіла ккусочак батончыка.



Ганка маўчала.

– Дык скажы, мая хітрая Ганулька, ты свой “Снікерс” з’ела? – раз за разам кусаючы батончык, дапытвалася Людмілка.

Ганка ўпарта маўчала, а толькі здзіўленымі вачыма пазірала на Люду, бо ў тае заставалася ўжо менш палавіны батончыка, і яна нават не думала з ёй дзяліцца.

– Ганулька мая шчодрая, ці ела ты “Снікерс”? – спытала знямоглая ад маўчання сяброўкі, Люда і запіхнула ў рот апошні кусочак.

– Ела, ела, – нарэшце, насупіўшыся выціснула з сябе Ганка, і праглынула сліну.

– І я свой з’ела! Дзякуй, табе, мая сябровачка-сястрычка! – прамяніста ўсміхнулася Люда і пяшчотна абняла Ганку.

## СУМЛЕННАЯ ДЗЯЎЧЫНКА

Веранічка ішла са школы адна. Яе сяброўка Валянцінка захварэла, таму было сумна. Яна разважала, як прыйдзе дадому, зробіць урокі, пабяжыць і праведае сяброўку. Дзяўчынка ішла праз школьны стадыён, каб скараціць шлях. Раптам яна заўважыла амаль утаптаную ў балота паперку. Прыглядзелася. Гэта былі сапраўдныя пяцьдзясят тысяч рублёў. Вераніка ўзрадавалася, падняла грошы, абцерла іх. Вырашыла, дома памыць іх і прасушыць. Цяпер яна ўжо марыла, на што можна патраціць гэтыя грошы.

“Куплю на ўсе цукерак, чыпсаў і пайду да Валянцінкі, – думала дзяўчынка. – Не, лепш пакладу на рахунак мабільнага тэлефона. Не, куплю ў кіёску самую прыгожую шпільку ў валасы. Не, лепш пакладу. Няхай ляжаць. Дазбіраю яшчэ – бабуля дасць, і куплю што-небудзь важкае.”

З такімі думкамі яна зайшла ў кватэру. Зрабіла ўрокі, і пайшла праведаць Валянцінку. Вераніка растлумачыла ёй новае дамашняе заданне, расказала школьныя навіны, а пра грошы змаўчала. Не хацела, каб сяброўка ведала.

Вечарам вярнуўся з вуліцы брат.

– Ведаеш? – пачаў ён гаворку, – Валерык Хілько з нашага класа сёння згубіў пяцьдзясят тысяч рублёў. Мама дала яму на школьныя абеды на гэты тыдзень. Бядак прасядзеў шэсць урокаў галодны. Можа прыйдзецца цэлы тыдзень галадаць, калі не адважыцца маме расказаць. У іх грошай не густа. Чацвёра дзяцей. Усіх трэба карміць і адзяваць.

– Няхай не будзе разявакам! – выпаліла Вераніка.

– А мне яго шкада, – спачуваў Паўлік.

– А мне не шкада! Няхай уважліва сочыць за сваімі рэчамі!

Вераніка зайшла ў пакой, адчыніла шуфляду і паглядзела на грашовую паперку. “Можа гэта не Валерыкавы грошы, можа хто іншы

згубіў! А калі яго, тады гэта будзе яму навука! Другі раз пільнейшым будзе! Не аддам!" – катэгарычна вырашыла дзяўчынка.

Вераніка старалася больш не думаць пра грошы, пра Валерыка. Але калі легла спаць, сон не прыходзіў. Мучыла сумленне. Дзяўчынка ўявіла, як Валерык сядзіць галодны шэсць урокаў, як на яго сварылася маці, калі расказаў пра губу, як, напэўна, хлопчык стаяў у кутку і плакаў. А калі не расказаў, то яшчэ цэлы тыдзень будзе галадаць у школе.

"Можа на фізкультуры выпалі грошы, а ён не заўважыў," – думала Вераніка. Так шкада рабілася Валерыка. Яна варочалася з боку на бок.

Раніцай дзяўчынка рашуча забрала з шуфляды грошы, паклала іх у кішэньку ранца і рушыла ў школу.

На перапынку сумленная дзяўчынка зайшла ў пяты клас. Валерык сумна сядзеў за партай. Вераніка падышла да яго і працягнула грошы.

– На, Валерык, я знайшла іх учора на стадыёне. Ведаю, гэта твае грошы.

– Дзякуй, Вераніка! – зірнуў яснымі ўдзячнымі вачыма хлопчык.

У Веранікі, нібы камень спаў з сэрца.

## КОНТР СТРАЙК

Хлопчык Міхась вельмі любіў гуляць у камп'ютарныя гульні. З раніцы да ночы ганяў з аўтаматам і кінжалам ворагаў у гульні "Контр Страйк". Часу вольнага хоць адбаўляй – на дварэ лета, а, значыць, канікулы.

Аднойчы з самай раніцы ён гуляў у гэтую жудасную гульню і не заўважыў, як надышоў вечар, на вуліцы сцямнела. Мама затрымлівалася на працы, а тата быў у камандзіроўцы. Вось раздолле для Міхася ў такія дні! Сам сабе і камп'ютару гаспадар. Ён раз за разам, этап за этапам праходзіў гульню "Контр Страйк". Нават паленаваўся ўстаць і ўключыць у пакоі святло. А навошта? У цемры нават цікавей гуляць. Мацнейшая ваенная гатоўнасць і напружанасць. Вось-вось з-за вугла з аўтаматам выскачыць вораг. Яго ж трэба імгненна застрэліць. А потым, асцерагаючыся, каб праціўнік не выстраліў у спіну, ці не ўсадзіў у бок кінжал, перабегчы па калідоры-лабірынту.

– Тр-тр-тр-р-р-р! – страляў аўтамат Міхася.

– Ага, застрэліў я цябе! – радаваўся хлопец. – А табе кінжал у бок, контра недабітая!

Міхась так паглыбіўся ў гульню, што яму здалося, быццам ў цемры пакоя прабегла нейкая постаць і схавалася ў яго за спінай. Хлопец ад страху ўціснуў галаву ў плечы і баяўся зварухнуцца з месца. Яму здавалася, што калі ён зробіць хоць адзін рух – атрымае кінжалам пад лапатку або аўтаматную чаргу. Міхась сядзеў нерухома. Толькі адчуў, як усё цела пакрылася халодным потам. Знямелыя рукі больш не націскалі ні на

мышку, ні на клавіятуру камп'ютара. А тут яшчэ штосьці рыпнула раз, затым яшчэ раз.

"Жах! Хтосьці адчыняе дзверы! – мільганула думка ў галаве. – Яны ж мяне застрэляць, прыкончаць. Напэўна, іх тут цэлая армія! Адзін я з імі не спраўлюся! Усё, канец мне!" І ён, беспрытомны, асунуўся на падлогу.

Ачнуўся хлопец ад рэзкага, непрыемнага паху. Ён убачыў разгубленую маму і дзядзечку ў белым халаце. Яны стаялі, схіліўшыся над ім.

– Міхаська, – дрыготкім голасам шаптала мама, – што здарылася, сынок!

Хлопец зноў заплюшчыў вочы. Дзядзечка-доктар прыадкрыў Міхасю вейкі, а там, у яго вачах – два аўтаматы наведзеныя проста на доктара.

– Ого! – адхінуўся ён. – Усё зразумела, "Контр Страйк". Гэта новая хвароба камп'ютарных хлопчыкаў.

Міхась зноў расплюшчыў вочы. Доктар памераў яму кравяны ціск, паслухаў сэрца і сказаў:

– Ну, што, браток, дагуляўся? Дабегаўся? А цяпер слухай, як будзем лячыць тваю хваробу. Кожнай раніцай ты павінен устаць, зрабіць фіззарадку, прыняць водныя працэдуры, паснедаць, і – на вуліцу, на стадыён, у парк, на рэчку… куды хочаш. Толькі не за камп'ютар! А замест гэтага пасля абеду бярэш цікавую кнігу на роднай беларускай мове і чытаеш. У камп'ютарныя гульні будзеш гуляць, калі выздаравееш, не болей адной гадзіны ў дзень. Зразумеў?

– Во-о-о! – скрывіўся Міхась. – Я не люблю чытаць. А без камп'ютара я не змагу пражыць так доўга.

– Зможаш! – цвёрда сказаў доктар. – Кнігі цалкам заменяць твае гульні.

Ты станеш усебакова развітым чалавекам, разумным і моцным духам.

Цяжка было хлопцу спраўляцца з камп'ютарнай залежнасю. Камп'ютар яго вабіў, клікаў, заварожваў... Але разумны наказ мудрага доктара і сіла волі Міхася ўзялі верх і перамаглі гэтую залежнасць.

Прайшоў месяц. І хлопец нарэшце зразумеў, што аніякія камп'ютарныя гульні не заменяць цікавую кнігу, таму што кніга – крыніца невычарпальных ведаў, радасці, перажыванняў. Кожная старонка кнігі – гэта чароўная скарбонка новых адкрыццяў, уражанняў, пачуццяў і цудаў.

## СУМЛЕННАЯ ДЗЯЎЧЫНКА

Веранічка ішла са школы адна. Яе сяброўка Валянцінка захварэла, таму было сумна. Яна разважала, як прыйдзе дадому, зробіць урокі, пабяжыць і праведае сяброўку. Дзяўчынка ішла праз школьны стадыён, каб скараціць шлях. Раптам яна заўважыла амаль утаптаную ў балота паперку. Прыглядзелася. Гэта былі сапраўдныя пяцьдзясят тысяч рублёў.

Вераніка ўзрадавалася, падняла грошы, абцерла іх. Вырашыла, дома памыць іх і прасушыць. Цяпер яна ўжо марыла, на што можна патраціць гэтыя грошы.

“Куплю на ўсе цукерак, чыпсаў і пайду да Валянцінкі, – думала дзяўчынка. – Не, лепш пакладу на рахунак мабільнага тэлефона. Не, куплю ў кіёску самую прыгожую шпільку ў валасы. Не, лепш пакладу. Няхай ляжаць. Дазбіраю яшчэ – бабуля дасць, і куплю што-небудзь важкае.”

З такімі думкамі яна зайшла ў кватэру. Зрабіла ўрокі, і пайшла праведаць Валянцінку. Вераніка растлумачыла ёй новае дамашняе заданне, расказала школьныя навіны, а пра грошы змаўчала. Не хацела, каб сяброўка ведала.

Вечарам вярнуўся з вуліцы брат.

– Ведаеш? – пачаў ён гаворку, – Валерык Хілько з нашага класа сёння згубіў пяцьдзясят тысяч рублёў. Мама дала яму на школьныя абеды на гэты тыдзень. Бядак прасядзеў шэсць урокаў галодны. Можа прыйдзецца цэлы тыдзень галадаць, калі не адважыцца маме расказаць. У іх грошай не густа. Чацвёра дзяцей. Усіх трэба карміць і адзяваць.

– Няхай не будзе разявакам! – выпаліла Вераніка.

– А мне яго шкада, – спачуваў Паўлік.

– А мне не шкада! Няхай уважліва сочыць за сваімі рэчамі!

Вераніка зайшла ў пакой, адчыніла шуфляду і паглядзела на грашовую паперку. “Можа гэта не Валерыкавы грошы, можа хто іншы згубіў! А калі яго, тады гэта будзе яму навука! Другі раз пільнейшым будзе! Не аддам!” – катэгарычна вырашыла дзяўчынка.

Вераніка старалася больш не думаць пра грошы, пра Валерыка. Але калі легла спаць, сон не прыходзіў. Мучыла сумленне. Дзяўчынка ўявіла, як Валерык сядзіць галодны шэсць урокаў, як на яго сварылася маці, калі расказаў пра губу, як, напэўна, хлопчык стаяў у кутку і плакаў. А калі не расказаў, то яшчэ цэлы тыдзень будзе галадаць у школе.

“Можа на фізкультуры выпалі грошы, а ён не заўважыў,” – думала Вераніка. Так шкада рабілася Валерыка. Яна варочалася з боку на бок.

Раніцай дзяўчынка рашуча забрала з шуфляды грошы, паклала іх у кішэньку ранца і рушыла ў школу.

На перапынку сумленная дзяўчынка зайшла ў пяты клас. Валерык сумна сядзеў за партай. Вераніка падышла да яго і працягнула грошы.

– На, Валерык, я знайшла іх учора на стадыёне. Ведаю, гэта твае грошы.

– Дзякуй, Вераніка! – зірнуў яснымі ўдзячнымі вачыма хлопчык.

У Веранікі, нібы камень спаў з сэрца.



**СЯБРОЎСТВА ПА-РАЗЛІКУ**

Мілана вучыцца ў шостым класе. Вучоба ішла паспяхова, пакуль не дабавілася фізіка. Не разумее дзяўчынка гэтых сілы прыцяжэння, электрычнага напружання, магутнасці, ды яшчэ шмат якіх фізічных з'яў і тэрмінаў.

"І навошта гэтыя Н'ютан, Ом, Паскаль, Фарадэй, Джоўль, Ампер і іншыя вучоныя фізікі напрыдумвалі розных законаў і формул. У галаве не ўкладваецца, як іх можна запомніць і рашаць такія складаныя задачы? – думала Мілана. – Але нікуды не дзенешся, трэба разбірацца ў гэтых законах і падцягваць фізіку".

Мама заўважыла і зразумела, што дочцы цяжка даецца гэты прадмет, таму адразу прапанавала наняць рэпетытара.

– Навошта? – запярэчыла дзяўчынка, – рэпетытару трэба грошы плаціць. А мне дапамогуць і без грошай. Я знайду выхад.

Мілана на кожным уроку фізікі прыглядалася, хто найлепш разумее гэты цяжкі прадмет. І нарэшце зрабіла вывад, што – Лада. Але з ёй Мілана не сябравала. Не далюблівала яна аднакласніцу за тое, што тая просценька апраналася, насіла не модную стрыжку і была сціплай "шэрай мышкай" у класе.

"Што ж рабіць? – разважала яна. – Прыдзецца пасябраваць з Ладай, каб растлумачвала мне незразумелыя тэмы па фізіцы. А за грошы, што былі б аддадзены на рэпетытара, папрашу ў мамы, каб купіла мне што-небудзь модненькае. Так і пастаўлю пытанне: "Я падцягваю фізіку, а ты мне – абноўку".

Кожны дзень Мілана "штурмавала" Ладу. То цукерку смачную ёй дасць, то кнігу цікавую прапануе пачытаць, то дадому падвезці, калі тата прыязджае па Мілану на машыне. І Лада пацягнулася да яе.

Аднойчы Мілана запрасіла яе да сябе дамоў. І Лада згадзілася. Чаму не, калі дзяўчынка па-сяброўску да яе ставіцца.

– Не разумею, Лада, як можна так цудоўна разбірацца ў фізіцы? Для мяне гэта "цёмны лес"! А ты, як вавёрка арэхі лузаеш задачы! Як можна запомніць гэтыя формулы? – з хітрынкай у хуткіх вочках, шчабятала дзяўчынка і падлівала гарбату ў кубак аднакласніцы.

– А што тут разумець? – усміхнулася Лада. – Галоўнае, вывучыць формулы, ведаць латынскія літары, якімі што абазначаецца. Падстаўляй у формулу лікі і рашай задачу. А таксама трэба разумець законы фізікі і фармуліроўкі, карыстацца імі пры рашэнні задач і на лабараторных работах. Я лічу, што тут нічога складанага няма.

– Дык можа ты мне дапаможаш разабраць незразумелыя тэмы? – спытала Мілана.

– З задавальненнем! – адразу згадзілася дзяўчынка. – Хоць сёння! Хоць зараз!

– Ну-у, давай паспрабуем, – нацягнута, нібы не хочучы, закаціла вочкі хітрая Мілана.

Яна дастала падручнік і канспект. Дзяўчынкі жвава пераселі за пісьмовы стол. Ад усёй душы, з поўнай адказнасцю, па некалькі разоў растлумачвала Лада сяброўцы незразумелыя тэмы. І Мілана нарэшце спасцігла амаль усе загадкі фізікі, якія былі для яе недасягальнымі.

– Ну, дзякуй, табе сяброўка! – выдыхнула яна і выцерла пот з чырвонага твару.

– Калі ты ўсё зразумела, дык я толькі рада за цябе, – добразычліва адазвалася Лада, – звяртайся, калі што! – усміхнулася яна. – Я заўсёды дапамагу.

– Добра! – згадзілася Мілана.

Цяпер фізіка ў яе пайшла, як "па масле". Яна разумела ўсё: рашала задачы і лёгка запамінала формулы. З кожным днём Мілана ўсё менш звярталася да Лады, а як сяброўка яна ўвогуле яе ўжо не цікавіла.

"У жыцці павінны быць толькі патрэбныя сябры. Якія могуць зрабіць што-небудзь карыснае, – думала эгаістка Мілана, – фізіка ў мяне ідзе на вышэйшым узроўні. Так што, бывай, Лада!"

У другім паўгоддзі пачаліся вельмі складаныя тэмы па алгебры. І Мілана зноў была азадачана, да каго ж "падкаціцца", каб растлумачваў ёй рашэнні складаных прыкладаў і задач. Яна ведала, што самая матэматычная галава ў Сняжаны, якая ўдзельнічала ў алімпіядах і нават займала першыя месцы. Толькі вось гэтая дзяўчынка не "лыкам шытая", да яе не так проста будзе паддабрыцца. Але Мілана знойдзе падыход. І чым хутчэй, тым менш будзе зацягнута алгебра, бо потым будзе цяжка ўсё нагнаць.

Мілана і так, і гэтак спрабавала наладзіць размову з непадступнай аднакласніцай, але тую нічога не цікавіла. Вырашыла дзяўчынка купіць

білеты ў тэатр і запрасіць ганарлівую Сняжану на спектакль. Але не, Сняжана ад спектакля адразу адмовілася і дала зразумець, што яна тэатрам не цікавіцца. Вось журнал “Бурда модэн” яна прыняла б, ці яшчэ лепш на паказ моднага адзення схадзіла б. Так што Мілана толькі грошы дарэмна на білеты патраціла. Юная інтрыганка ўжо хацела пакінуць свае патаемныя задумкі, але ў горад прыехаў маскоўскі цырк-шапіто.

“Ад цырка Сняжана не адмовіцца, – думала Мілана, – хто не хоча сваімі вачыма ўбачыць славутых дрэсіроўшчыкаў дынастыі Дуравых, ці сапраўднага факіра з танцуючай корбрай і шмат чаго яшчэ цікавага, што абяцалі рознакаляровыя анонс-афішы, якія віселі амаль у кожным гарадскім аўтобусе і тралейбусе”.

Мілана папрасіла ў маці грошы і купіла білеты. Дзяўчынка была ўпэўнена, што яе мэта ўжо на палову дасягнута. Пасля заняткаў яна падышла да Сняжаны.

– Ведаеш, маёй маме далі на працы два бясплатныя білеты ў цырк. Я падумала, каму б прапанаваць адзін з іх? І вырашыла – табе, – схлусіла дзяўчынка.

– Калі так, дык я згодна, – падцяла губкі, закаціла вочкі, але пагадзіласяаднакласніца.

У суботу, каб не выглядаць горш, чым “крутая” Сняжана, Мілана надзела самыя модныя джынсы. Яна падмалявала вейкі і, праспаўшы ўсю ноч на бігудзях, накруціла свае доўгія валасы. Выглядала дзяўчынка па-даросламу прыгожа, проста шыкоўна. Сняжана ажно пазайздросціла, што аднакласніца на гэты раз выглядае прыгажэй і мадней за яе.

Дзяўчынкам вельмі спадабалася першая частка прадстаўлення. Падчас антракту Мілана частавала Сняжану рознымі прысмакамі, якія прадаваліся ў кіёску. А потым зірнуўла ў пусты кашалёк і сумелася – грошы скончыліся.

“Лепш бы я рэпетытара наняла, – незадаволена падумала яна, – а то прагінаешся тут перад гэтай ганарлівай Сняжанай, і аніякіх вынікаў. Усё, трэба пераходзіць да справы! Час ідзе, а алгебра стаіць на месцы.”

Закончылася цыркавое прадстаўленне. Дзяўчынкі выйшлі на вуліцу ўражаныя і задаваленыя. Сняжана нават узяла Мілану за руку і праспявала:

– Ой, які цудоўны цырк ты мне падарыла! Я бачыла вянгерскі, балгарскі, але маскоўскі мне спадабаўся найбольш. Дзякуй табе!

– Я вельмі рада! – таксама на ўзвышанай ноце адказала Мілана.

– Можа зойдзем да мяне? Я цябе гарбатай пачастую за бясплатны білет і твае пачастункі! – раптам прапанавала Сняжана.

– Я згодна, пайшлі! – узрадавалася аднакласніца.

І дзяўчынкі, махаючы рукамі, пакрочылі.

– Заходзь, – адчыніла дзверы ў кватэру Сняжана.

Мілана пераступіла парог і ажно рот адкрыла. У кватэры было так прыгожа, шыкоўна і ўтульна!

“Вось чаму Сняжана такая ганарлівая, – адразу мільганула думка ў галаве Міланы, – у яе, напэўна, вельмі багатыя бацькі.”

– Ну, праходзь, чаго збянтэжылася? – усміхнулася аднакласніца.

Яна прыгатавала гарбату і паставіла на стол прысмакі. Такога пячэння і цукерак Мілана ніколі не ела. Яна такія прысмакі бачыла ўпершыню. А які водар зыходзіў ад гэтых дзіўных пачастункаў!

– Сядай за стол і не здзіўляйся. Мой тата ўжо чатыры гады працуе ў Амерыцы, таму мы з мамай можам усё сабе дазволіць: і дарагое адзенне, і шыкоўны рамонт, і самыя дарагія прысмакі, – хвалілася Сняжана.

– Цяпер я ўсё разумею, – сціпла ўсміхнулася Мілана і падсела да стала.

Дзяўчынкі пілі гарбату і размаўлялі на розныя тэмы. Нарэшце размова пайшла пра школьныя выпадкі і прыгоды. І Мілана закранула балючае пытанне.

– Сняжана, ты так добра разбіраешся ў алгебры. А цяпер такія цяжкія тэмы. Гэтыя складаныя прыклады і задачы для мяне проста – завал! Можа ты мне іх патлумачыла?

Сняжана сядзела насупраць аднакласніцы і, падпёршы рукамі галаву, абыякава пазірала на яе.

Мілана замаўчала.

– Добра, – нарэшце ляніва прамовіла Сняжана, – толькі не сёння.

– Тады давай заўтра, выхадны, цэлы дзень вольны, – адразу павесялела Мілана.

Прыйшло заўтра і пасля заўтра, і пасля… пасля заўтра… А справа стаяла на месцы. Сняжана толькі абяцала. Яна заўсёды была чымсьці занята. І тады Мілана зразумела, што Сняжана – "абяцалкіна". Больш яна яе ні аб чым не прасіла. Не магла Мілана сабе прабачыць, што столькі часу і грошай дарэмна патраціла на аднакласніцу.

Дзяўчынка кінулася да Барыса, які таксама добра разбіраўся ў алгебры. Але хлопец адмовіў ёй, бо ўвесь вольны час займаўся спортам. Мілана прасіла і іншых, не такіх ужо знаўцаў, але ёй ніхто не дапамог. Тады дзяўчынка моцна пашкадавала, што парвала сяброўства з Ладай, якая не горш разумела алгебру, чым фізіку. Вырашыла яна спытаць ў Лады:

– Можа ты мне растлумачыш, як рашаць прыклады і задачы па агебры? Я зусім не разумею апошнія тэмы…

Нічога не адказала ёй аднакласніца, а толькі зірнула Мілане ў вочы так, што тая ўсё зразумела і без слоў.

## СОНЕЧНАЯ ДЗЯЎЧЫНКА

Ангеліна самая непрыгожая дзяўчынка ў класе. Хлапчукі-аднакласнікі абзываюцца, смяюцца з яе доўгага з гарбінкай носа, рэдкіх рудых валаскоў. А галоўнае, тварык дзяўчынкі, нібы яечка куліка, увесь усыпаны вяснушкамі. Ангеліна з жахам падыходзіць да люстэрка. Бывае цэлы тыдзень не глядзіцца ў яго, каб не сапсаваць сабе настрой. З люстэрка на яе заўсёды пазіраюць,

прыгожыя, але сумныя, сумныя вочкі. У іх, не па гадах, адлюстраваны роспач, смутак і незадавальненне сабою.

Аднойчы ў клас, дзе вучылася Ангеліна, зайшоў вучань з паралельнага класа. Ён падышоў да яе і пачаў моцна рагатаць:

– Ха-ха-ха! Баба Яга з гарбатым носам! Малпа рыжая! Лысая! Фу-у-у! –крычаў Валерык і паказваў пальцам на Ангеліну.

Дзяўчынка не ведала што рабіць, куды схавацца? Яна ў роспачы выбегла з класа і паімчалася на вуліцу. Вочы засцілалі слёзы. Ангеліна забегла за школу, забілася ў куточак і наўзрыд заплакала.

"Які жах! Як мне гэта перажыць? Чаму за мяне ніхто не заступіўся?! Значыць, пра мяне ўсе вучні думаюць гэтак жа!Чаму я такая нешчаслівая?!" – плакала яна.

Дзяўчынка атрымала глыбокі эмацыянальны стрэс. Яна не пайшла больш на заняткі, не вярнулася ў клас. Без рукзака і школьных прылад рушыла дадому. Балючы жах сціскаў сэрца, у вушах гучалі словы абразы, а з вачэй бесперапынна цяклі слёзы.

"Заўтра таксама не пайду ў школу… і пасля заўтра… і ніколі, ніколі не пайду… – думала бедная Ангеліна, – як я буду глядзець у вочы аднакласнікам?"

Але тут прыйшла другая, супрацьлеглая думка.

"А як жа будуць глядзець мне ў вочы аднакласнікі? Чаму ім не сорамна, што не заступіліся за мяне, не прагналі гэтага абзывалу-Валерыка з класа? Няхай ім будзе брыдка за свае паводзіны. Я стану моцнай, я ўсё перажыву! Хутка скончыцца пераходны ўзрост, і я буду прыгожай".

Яна зайшла ў кватэру. Дома яшчэ нікога не было. Мама і тата на працы, брат Вадзік у дзіцячым садку. Ангеліна зірнула ў люстэрка. Адтуль на яе пазірала сапраўды непрыемная істота: падпухлыя ад слёз вочкі, доўгі гарбаты носік, а галоўнае – гэтыя агідныя вяснушкі яшчэ больш гарэлі на бледным тварыку.

– Ну і жах! Сапраўды, кікімара! Чаго тут крыўдзіцца?!

На душы было так прыкра, быццам туды закінулі чорную абсмаленую галавешку, якая балюча тлела, апякала яе маладзенькую істоту.

– Божа! Чаму я такая непрыгожая?! Навошта ты мяне стварыў такую?! Каб з мяне здзекаваліся?! За што мне ўсё гэта?! Што мне рабіць?! – прашаптала яна.

Дзяўчынка села на канапу, закрыла далонямі твар і моцна роспачна заплакала. А потым, змучаная, заснула моцным сном, у якім трывожна ўздрыгвала і сутаргава ўсхліпвала.

Сніўся ёй сон: прабіраецца яна праз густы, кашлаты яловы лес. Калючыя іголкі балюча б'юць па тварыку. Ногі, рукі, усю яе драпаюць густыя непралазныя зараснікі і старыя елкі. Здаецца, канца-краю няма гэтаму цёмнаму густому лесу. Дзяўчынка, знясіленая, узняла вочы ў неба і ўбачыла, як праз агідны калючы ельнік прабіваюцца светлыя цёплыя сонечныя праменьчыкі. Яна нават вочкі прыжмурыла і нечакана для себе – ўсміхнулася.

Агнеліна не заўважыла, як з непрыемнага лесу выйшла на ясную сонечную паляну. Яна была ўсыпана прыгожымі ляснымі кветкамі, ад якіх зыходзіў непаўторны водар. Над яркімі кветкамі танцавалі казачна-прыгожыя матылькі. Настрой у дзяўчынкі імгненна змяніўся, яна радасна запляскала ў далоні і закружылася разам з матылькамі. Ды раптам заўважыла, што адзенне на ёй бруднае і парванае.
“Нічога, – падумала Ангеліна, – усё роўна акрамя матылькоў, ніхто мяне тут не ўбачыць”.

І ў гэты момант на ёй заззяла прыгожая доўгая сукенка сонечна-аранжавага колеру, уся ўсыпаная блішчынкамі, як у казачнай прынцэсы.

– Ах! Як прыгожа! Як цудоўна! – дзівілася Ангеліна. – Але хто гэта мнеўсё падарыў?
Дзяўчынка зірнула на неба і ўсміхнулася сонцу.

– Сонейка, гэта ты?! І ты, напэўна, Неба?!
Яна закружылася і адчула, як развейваюцца веерам яе густыя, доўгія валасы.

– Хто падарыў мне такія валасы? – усклікнула Ангеліна. – Я, ведаю, гэта вы, Сонца і Неба!

Неўзабаве дзяўчынка пачула тоненькі, пералівісты звон. Яна азірнулася і ўбачыла казачна-апранутага хлопчыка, які ішоў да яе і званіў залатым званочкам…

У гэты момант Ангеліна прачнулася. У іх кватэру хтосьці бесперапынна званіў. Яна спахапілася і пабегла адчыняць дзверы. На парозе стаяла аднакласніца Жанна, з якой яна сядзела за адной партай.

– Я прынесла твой рукзак, – прамовіла яна і апусціла галаву.

– Дзякуй, – сказала Ангеліна.

– Ну, я пайшла… да пабачэння… – развіталася аднакласніца і рушыла даліфта.
Ангеліна зачыніла дзверы і вярнулася ў свой пакой. Яна легла на канапу і заплюшчыла вочы.

– Які цудоўны, казачны сон. Хачу, каб ён прадоўжыўся, – сказала дзяўчынка.
Але душа зноў заныла, сэрца ёкнула. Яна ўспомніла сённяшнюю жудасную сцэну ў класе.

– Не ўспамінаць! – раптам запярэчыў яе ўнутраны голас, – не думаць пра дрэннае! Толькі добрыя, прыемныя думкі могуць перамяніць тваё жыццё ў лепшым напрамку!
“Але дзе тыя добрыя думкі? – сумна падумала дзяўчынка, – нічога прыемнага ў маім жыцці не было. Адны прыкрасці ў школе, здзекі. Што можа ўзрадаваць акрамя таго, што вучуся добра?”

– Дык гэта ж цудоўна! – усклікнуў унутраны голас. – За гэта і чапляйся!Усміхніся! Усмешка ўпрыгожвае нават самых непрыемных і злых. Ты станеш сімпатычнай!

– Сімпатычнай?! – ухмыльнулася Ангеліна, абыякава празіраючы на столь.

– Так! Зразумела! – не адступаў унутраны голас. – Ты станеш

прыгожай! Уяві, цябе сёння не абсмяялі, а, наадварот, нагаварылі кампліментаў, асыпалі цудоўнымі, самымі цёплымі словамі. Усміхніся. Ты самая прыгожая дзяўчынка ў класе! Ты самая таленавітая!

– Хопіць! Адчапіся! – закрычала Ангеліна.

– Не хопіць! – не згаджаўся ўнутраны голас. – Валерык сказаў, што ты вельмі прыгожая, добрая, твае рысы твару вельмі прыемныя. Падымайся, усміхайся, зрабі што-небудзь карыснае…

– Ну ўсё, дастаў, – прабурчала дзяўчынка.

Яна незадаволеная ўстала з канапы і пайшла на кухню.

“Можа прыгатаваць любімыя мучныя аладкі? Іх усе любяць. І маме будзе дапамога і радасць ад мяне, – адразу закружыліся думкі ў галаве, – а пра дрэннае і пякучае, сапраўды, пастараюся не думаць. Прыйдзе час і ўсё стане на свае месцы”.

Вечарам уся сям’я сабралася за сталом. Ангеліна свяцілася шчасцем ад мамінай і татавай пахвальбы.

– Якая смаката! – хваліў тата. – Нават у мамы не такія смачныя і румяныя атрымліваюцца! Тут, напэўна, ёсць нейкі сакрэт?

– Ёсць, – згадзілася дзяўчынка, – усё трэба рабіць з усмешкай і любоўю да справы.

Мама падняла здзіўленыя вочы на дачку.

– Малайчы-ы-ына! – працягнула яна. – Правільна разважаеш. Аладкі сапраўды свецяцца тваёй усмешкай і дабрынёй!

– Так, так, яны круглыя, жоўценькія, як цёплае сонейка, і вельмі смачныя! – падцвердзіў брацік Вадзік, махаючы пад сталом ножкамі ад задавальнення і смакаты.

Ангеліна адразу ўспомніла сонечны сон, што прысніўся ёй днём. Дзяўчынцы падалося, што парванае, бруднае адзенне паступова апаўзае з яе збалелай душы. І там паціху ўзыходзіць сонейка. Яна абвяла ўсіх паглядам і цяжка ўздыхнула. Ніхто нават не здагадаўся, які балючы стрэс атрымала дзяўчынка ў школе.

– Я моцная! Я ўсё вытрымаю! – запэўніла яна сябе.

Ангеліна хуценька зрабіла дамашнія заданні. Яна больш не думала пра дрэннае і негатыўнае.

– Сёння Валерык асыпаў мяне прыемнымі кампліментамі. Ён сказаў, што я вельмі прыгожая. Я самая прыгожая! У мяне ўсе рысы твару прыемныя, – шаптала сама сабе дзяўчынка, калі легла спаць.

Яна не вытрымала – устала з канапы, уключыла святло і падышла да люстэрка. Пачала разглядаць сябе.

“Калі крыху падмаляваць вейкі, бровы зрабіць танчэйшымі, акругліць твар, тады нос стане менш заўважны і не такі доўгі, – па-даросламу разважала Ангеліна, – можна карыстацца касметыкай. Я ж ужо ў пятым класе.”

Дзяўчынка ўсміхнулася і заўважыла, што твар яе пакруглеў, зрабіўся больш прывабным. А вочкі павесялелі і заблішчэлі надзеяй на лепшае будучае.

– Не, нічога не буду рабіць. Толькі больш есці, каб пакруглелі шчочкі, тады і носік стане прыгажэйшым. Але ж гэтыя вяснушкі! Што з імі рабіць?

– Ну і што! – зноў умяшаўся ўнутраны голас. – Падумаеш, у Алы Пугачовай таксама вяснушкі, а яна ўсё жыццё праспявала! Стала вядомай на ўвесь свет спявачкай! Ха! Дзівачка! Не сумуй! Гэта ж азначае, што ў дзень твайго нараджэння да цябе завітаў вясёлы сонечны праменьчык, і пацалаваў у самы носік. І цяпер ты – СОНЕЧНАЯ ДЗЯЎЧЫНКА! Гэта ж цудоўна!

Ангеліна ўсміхнулася і пайшла спаць.

Раніцай дзяўчынка зайшла ў клас. Яна старалася не думаць пра тое, што адбылося ўчора. Ангеліна бадзёра прывіталася з аднакласнікамі і прамяніста ўсміхнулася. У класе павісла цішыня. Нібы зачараваныя, вучні здзіўлена пазіралі на яе. Перад імі з’явілася іншая дзяўчынка – самаўпэўненая, жыццярадасная і, нават, прыгажэйшая!

– Малайчына! Малайчына! – трыумфаваў унутраны голас. – Спрацавала!Так трымаць! Я з табою!

Ангеліна зноў усміхнулася.

На ўроках яна ўпэўнена адказвала на пытанні, а калі чаго не ведала, дык толькі сціпла ўсміхалася. І настрой у яе не псаваўся.

З кожным днём дзяўчынка была ўсё больш задаволена сабой. З аднакласнікамі яна старалася сябраваць, нікому не адмаўляла ў дапамозе, растлумачвала незразумелыя тэмы, і неўзабаве стала карыстацца ў іх аўтарытэтам.

Самыя прыгожыя дзяўчынкі ў класе не маглі зразумець, што гэта робіцца з іх аднакласніцай, якая становіцца не толькі адметнай і ўпэўненай асобай, а нават прыгажэе на вачах.

Незаўважна прабег навучальны год. Ангеліна паступова прывыкла толькі да прыемных і добрых думак пра сябе, аднакласнікаў, сяброў, настаўнікаў. Унутраны свет дзяўчынкі стаў настолькі багаты пазітыўнай энергіяй, што яе хапіла б на ўвесь клас, у якім яна вучылася. Ангеліна даўно, з таго самага дня, калі яе абразіў Валерык, не пускала дрэнных думак у сваё жыццё, не звяртала ўвагі на непрыемныя словы ў свой адрас. Усё кепскае і негатыўнае яна імгненна пераўтварала ў добрае і светлае. Дзяўчынка навучылася прабачаць. І жыццё яе стала больш радасным і светлым. Цяпер Ангеліна дасканала ведала, што яна прыгожая Сонечная дзяўчынка, а галоўнае – моцная духам! Гэта была яе свядомая тайна. І нікому яна яе не адкрые.

Праляцелі гады. Ангеліна вырасла. Стала сімпатычнай і мілай дзяўчынай. Вяснушкі на яе твары з’яўляліся толькі вясною і летам. Быццам сонейка напаміналa, што яна Сонечная дзяўчынка, і пасылала ёй свае адмецінкі. А восенню вяснушкі патухалі – адпачывалі разам з сонцам.

Вось і апошняя лінейка. Шмат цёплых, прыемных пажаданняў і наказаў пачулі выпускнікі. На душы Ангеліны было радасна, святочна, але крыху трывожна… Апошні званок, а дакладней – званочак, звінеў у руках прыгожага першакласніка, якога вёў за руку абаяльны, высокі выпускнік, у светлым святочным касцюме з гальштукам-матыльком і яснай прамяністай усмешкай на вуснах. Ім аказаўся Валерык. Так, той самы Валерык, што калісьці, як здавалася дзяўчыне, смяротна яе пакрыўдзіў.

Праходзячы каля Ангеліны, юнак здзіўлена зірнуў у яе чыстыя шчырыя вочы. Хлопец сумеўся і, нават, крыху сцішыў крок. Такіх вачэй ён яшчэ не сустракаў. Дзяўчына адкрыта, адважна, без следу даўняшняй крыўды, глядзела на яго. А потым перавяла позірк на першакласніка, які падаўся ёй знаёмым, і раптам успомніла свой даўні казачны сон з дзяцінства. Ангеліна зразумела, што гэта той самы чароўны хлопчык, якога яна сустрэла на кветкавай паляне!

…На выпускным вечары Ангеліна выглядала прынцэсай. Яна з густам падмалявала вейкі, лёгкі макіяж прыдаваў ёй асаблівы шарм. Сукенка залаціста-сонечнага колеру, як у тым казачным сне, падцвярджала, што яна, сапраўды, – Сонечная дзяўчына. Разам з выпускнікамі Ангеліна спявала і танцавала, удзельнічала ў вясёлых конкурсах і віктарынах.

Валерык увесь вечар патаемна назіраў за ёю, а потым адважыўся запрасіць на павольны танец. Ён вёў дзяўчыну ў танцы і не зводзіў вачэй з яе адкрытага прамяністага твару. У канцы танца юнак пяшчотна сціснуў яе руку ў сваёй цёплай далоні і шчыра сказаў:

– Ты стала такой прыгожай, Ангеліна, а сёння, дык асаблівa…

Дзяўчына сціпла апусціла вочы і заірдзелася, нібы спелая восеньская рабіна. Крыху памаўчаўшы, Валерык дадаў:

– Я хачу папрасіць у цябе прабачэння за тое, што некалі ў пятым класе Балюча абразіў цябе. Цяпер я вельмі шкадую. Памятаеш, я ж тады быў сапраўдным хуліганам. Усім надакучваў сваімі паводзінамі. Прабач мяне, калі ласка… І яшчэ… я б хацеў з табой сябраваць… – пачырванеў хлопец, – ты мне вельмі падабаешся.

Ён зірнуў у разгубленыя вочы Ангеліны і пяшчотна правёў далонямі па яе доўгіх, шаўковых, залацістых валасах…